№ 18 (663) 12 мая 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднаўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Пяць плюсаў і пяць мінусаў Віталя Рымашэўскага**

Старонка 3



**Як каталі ў Сярэднявеччы**

Старонка 11



**Расійскі бізнэсоўца скупляе беларускія сядзібы**

Старонка 13

**У НУМАРЫ**

**Канстанцін Гайдук: «Увесь род наш зніштожылі»**

Яго бацька быў рэпрэсаваны НКВД, вёску спалілі нацысты, дзядзькоў расстралялі савецкія партызаны. **Старонкі 2, 8—9.**

**Снягір у клетцы**

Былы пракурор Мінскай вобласці асуджаны на сем гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму. **Старонка 3.**

**Еўраапакаліпсіс адкладаецца**

Члены ЕС могуць разлічваць на гіганцкія антыкрызісныя фонды. **Старонка 4.**

**Ці належыць беларусам чапляць георгіеўскія стужкі?**

Іх рэкламуюць на білбордах, развешваюць на вітрынах крамаў, раздаюць на вуліцах. Што гэта за стужка і якое дачыненне да Беларусі яна мае? **Старонка 7.**

**БЕЛАРУСКІЯ АЎДЫЯКНІГІ**

можна штодня набыць

у краме «КНІГІ»

па адрасе: *Мінск, вул.Захарава, 27*






## «За 25 год лётнай практыкі я такога страшнага выпадку не бачыў»

Відавочцы: у часе парада над Нямігай ледзь не сутыкнуліся ваайсковыя самалёты. **Старонка 5.**

# Пяць гадоў за пяць патронаў

Абвінавачанні ў тэрарызме і падпалах знятыя. Але з турмы Аўтуховіча не выпускаюць.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Упершыню ў незалежнай Беларусі справа па тэрарызме разглядалася ў судзе. Сведка Аляксандр Ларын пераконваў, што па загадзе Мікалая Аўтуховіча (які тады ўжо быў у турме па першай крымінальнай справе) і пры дапамозе Уладзіміра Асіпенкі рыхтаваў замах на гродзенскага губернатара Уладзіміра Саўчанку. Зброяй быў абраны гранатамёт. Але ў апошні момант, казаў Ларын, ён вырашыў адмовіцца ад замаху.

Другі эпізод справы звязаны з намеснікам міністра па падатках і зборах Васілём Камянко. Ларын сцвярджаў, што Аўтуховіч рыхтаваў ліквідацыю Камянко, помсцячы за знішчэнне бізнесу. Ларын казаў, што для гэтага Аўтуховіч купіў у Маскве цацачную яхту, з якой потым меўся зрабіць самаробнае выбуховае прыстасаванне. Цацка павінна была заехаць пад машыну Камянко і выбухнуць.

Трэцяе абвінавачванне — Аўтуховіч замовіў падпалы дамоў двух ваўкавыскіх чыноўнікаў у 2005 годзе.

Ну і нарэшце чацвёрты артыкул тычыўся незаконнага захоўвання і перавозкі зброі. Прыператрусе падчас арышту ў Аўтуховіча ў сейфе знайшлі пяць патронаў і паляўнічую вінтоўку. Гэтая зброя некалі належала Аўтуховічу, але пасля першай адседкі ён згубіў права на валоданне карабінам. Але гэта выглядала самым нязначным абвінавачваннем.

**Працяг на старонцы 3.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

## Скрадзеная перамога былога партызана

**Успаміны Канстанціна Гайдука, які падлеткам працаваў у партызанскім шпіталі: нязручныя для афіцыёзу, неацэнныя для нашчадкаў.**

Усё меней застаецца людзей, якія бачылі апошнюю вайну на свае вочы. Але дзіўная рэч: і такім людзям у сучаснай Беларусі, здараецца, не даюць слова.

У рэдакцыю «НН» звярнуўся Канстанцін Гайдук, 79-гадовы жыхар Бягомля. Падлеткам ён працаваў у партызанскім лясным шпіталі. Пабачыў столькі, што хапіла б на захапляльную кнігу. Але дзяржаўныя выданні, у якія спадар Гайдук дасылаў свае ўспаміны, адмовіліся даць яму слова: надта ўжо нязручная яго ваенная праўда. Справа ў тым, што Канстанцін Гайдук не толькі памятае пакуты мясцовых жыхароў і геройчныя справы абаронцаў, але не забыўся і на тое, як некаторыя дзеячы, выбіўшыся ў партызанскія камандзіры, чынілі гвалт над няўгоднымі ім людзьмі, зводзілі асабістыя рахункі.

Канстанцін Гайдук сведчыць не толькі ад свайго імя. Ён правёў сапраўднае даследаванне, абышоў ваколіцы Бягомльшчыны, сустракаўся са сведкамі падзеяў — і з ахвярамі, і з былымі партызанамі.

Між іншым, пра нашумелыя ўспаміны свайго земляка Іллі Копыла, надрукаваныя ў «Народнай волі», спадар Гайдук адгукаецца з саркастычнай усмешкай. У адрозненне ад спадара Копыла, які глядзеў на вайну дзіцячымі вачыма, Канстанцін Гайдук на ўласнай скуры адчуў, як лютавалі на Бягомльшчыне немцы. Не шкадуе ён і моцнага слоўца для тых, хто добраахвотна прыслугоўваў нацыстам. Але і пра справы некаторых партызанскіх камандзіраў спадар Гайдук маўчаць не хоча.

З успамінаў Канстанціна Гайдука вынікае, што зярняткі нянавісці, пасеяныя яшчэ ў часы сталінскіх рэпрэсіяў, узышлі ў пякельных умовах вайны, і быў крывавым умалот. У 1930-ыя НКВД знішчыла бацьку Канстанціна Гайдука, нацысты спалілі вёску ў вайну, а партызанскі атрад расстраляў яго дзядзькоў як «падазроных», родзічаў «ворага народа». Падобны лёс быў у многіх яго землякоў. Тым не менш, Канстанцін Гайдук пайшоў у партызаны, дапамагаў ратаваць раненых, цешыўся з вызвалення роднай вёскі савецкімі салдатамі. А што сёння? Яму і слова вымавіць не даюць. Вось вам і скрадзеная перамога, пра якую апошнім часам так шмат гавораць і пішуць...

**Алесь Кудрыцкі**

**Успаміны Канстанціна Гайдука — старонкі 8—9.**

# На дзяржпрадпрыемстве Уладзіміру Шылу далі адпрацаваць тры дні

**А пасля да начальніка прыйшоў кагэбіст.**



Уладзімір Шыла з Салігорска 6 мая звольнены з дзяржаўнага прадпрыемства. Яшчэ а 9-й раніцы мужчыну ў кабінет выклікаў начальнік, які расказаў, што напярэдадні ў яго была размова ў адпаведных органах. Тэмай гутаркі было працаўладкаванне сп.Шылы.

Перад начальнікам было пастаўленае пытанне: альбо ты звальняеш Шылу, альбо ў цябе з'яўляюцца праблемы.

Уладзімір Шыла на новую працу ўладкаваўся толькі 3 мая. «Я ведаю, што падобнае можа адбыцца, але не думаў, што настолькі хутка. Гэтая сістэма абсалютна гнілая», — кажа Шыла.

Уладзімір не хоча называць прадпрыемства, дзе ён працаваў, каб потым не ўзніклі праблемы ў кіраўніцтва. Па адукацыі Уладзімір Шыла інжынер-будаўнік, на прадпрыемстве працаваў таксама ў будаўнічым падраздзяленні.

Уладзімір Шыла — бацька вядомых у Салігорску моладзевых лідэраў Івана і Іллі. Сам Уладзімір таксама неаднаразова ўдзельнічаў у акцыях апазіцыі. За што некалькі разоў адбываў пакаранне на сутках. Удзельнічаў у Плошчы.

**Зміцер Панкавец**

## Яшчэ адна сталічная школа прапануе навучанне па-беларуску

**Набор у першыя класы пачнецца з 1 чэрвеня.**

Да сямі мінскіх школ з беларускамоўным навучаннем дадалася школа №68 з фальклорна-тэатральным ухілам. Тут навучаюць тэатральнаму майстэрству, танцу, спевам, ігры на цымбалах і баяне. У школе дзейнічае 10 беларускамоўных класаў.

Прапануем падрабязную інфармацыю, адрасы і кантакты.

**Гімназія №4** (вул. Кунцаўшчына, 18) прапануе навучанне ў фізіка-матэматычных, хіміка-біялагічных і філалагічных класах.

Даведка: e-mail: gymn4.minsk.edu.by, т.258-49-71, 258-49-74.

***

**Гімназія №9** (вул.Сядых, 10) — вывучэнне ўсіх прадметаў па-беларуску, паглыбленае вывучэнне англійскай мовы, факультатыўнае — польскай. Прапануе вывучэнне прадметаў музычнага цыкла.

Даведка: т.283-04-21, 281-38-04.

***

**Гімназія №23** (пр. Незалежнасці, 45) прапануе вывучэнне прадметаў па-беларуску, а таксама выкладанне на высокім узроўні англійскай, кітайскай, польскай моваў.

Даведка: e-mail: gymn23@minsk.edu.by; т.284-47-62, 284-87-16.

***

**Гімназія №28** (пр.Ракасоўскага, 93) прапануе выкладанне ўсіх прадметаў на роднай мове, а таксама паглыбленае вывучэнне французскай мовы, міжнародныя абмены, а таксама выкладанне прадметаў на французскай мове (краіназнаўства, літаратура Францыі) па праграмах, распрацаваных настаўнікамі школы.

Даведка: e-mail: sch2@minsk.edu.by.; т.248-32-02, 248-12-64.

***

**Гімназія №14** (вул. Васняцова, 10) прапануе паглыбленае вывучэнне замежных моваў, спецкурсаў па міфалогіі, псіхалогіі, асновах эканамічных ведаў, журналістыцы і шмат іншага. На базе гімназіі дзейнічаюць фальклорны ансамбль, музеі, літаратурная студыя і студыя бальных танцаў.

Даведка: т.295-01-33, 295-21-31.

***

**СШ №190** (вул.Нікіфарава, 19) — выкладанне на беларускай і расійскай мовах. Школа прапануе таксама бясплатную музычную адукацыю і спартыўныя секцыі.

Даведка: т. (017) 260-24-90; e-mail:sch190@minsk.edu.by.

***

**Школа №60** (вул.Лібкнехта, 82) — навучанне з музычным ухілам. У школе дзейнічаюць шматлікія гурткі, клубы, музей, творчыя і грамадскія аб'яднанні.

Даведка: 208-69-74, 209-94-49.

***

**СШ №68** (зав. Ахоцкі, 17, ст.м. «Магілёўская») прапануе навучанне па-беларуску. Набор у класы з фальклорна-тэатральным напрамкам.

Даведка: e-mail: sch68@minsk.edu.by; т. 243-76-82.

Да чытачоў. Дасылайце ў рэдакцыю інфармацыю пра беларускамоўнае навучанне ў вашым раёне. Пішыце пра новыя ініцыятывы бацькоў і ўпраўленняў адукацыі.

**Сямён Печанко**

### Самае чытанае на nn.by за 5—11 мая

- Відавочцы: У часе парада над Нямігай ледзь не сутыкнуліся ваенныя самалёты
- Аўтуховіч: пяць гадоў за пяць патронаў
- П'яныя танцы выбарчай камісіі ў Чашніках (2008 г.)
- Назад, у 40-я
- Эстонская палітык знялася аголенай для Playboy + фота
- Ці належыць беларусам чапляць георгіеўскія стужкі?
- Чым была для Беларусі тая перамога?
- У Мінску на занятках фізкультуры загінуў студэнт
- Пяць плюсаў і пяць мінусаў Аляксандра Мілінкевіча
- Віталь Рымашэўскі: У мяне найбольшыя шанцы стаць адзіным кандыдатам ад БНБ

### nn@nn.by

Лётчык [які ўратаваў самалёт ад аварыі 9 мая — Рэд.] малайчына, ягонае майстэрства ўратавала не адно жыццё. Але пра гэты подзвіг шырокія масы ўсё адно не даведаюцца, бо на афіцыйным узроўні, вядома ж, усё будзе замоўчана.

**Dzianis**

## Сцісла

• **Лукашэнка рыхтуе IV Усебеларускі сход.** Аляксандр Лукашэнка даручыў да 1 ліпеня 2010 года падрыхтаваць прапановы па даце правядзення сходу і колькасці яго ўдзельнікаў. Кіраваць аргкамітэтам прызначаныя кіраўнік Адміністрацыі Уладзімір Макей і прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі.

• **Зянон Пазняк за байкот выбараў.** «Паколькі сілы, якая змагла б перамагчы дыктатуру, скарыстаўшы фальшывыя выбары, яшчэ не існуе ў грамадстве, — выбары трэба байкатаваць, каб рыхтаваць такую сілу», — заяўляе лідэр Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ.

• **Фінляндыя адкрые пасольства ў Мінску.** Пра гэта заявіў у Хельсінкі міністр замежных спраў Аляксандр Стуб. На сённяшні дзень інтарэсы Фінляндыі ў Беларусі прадстаўляе амбасада ў Літве.

• **Кошты віз для дзяцей у Балгарыю зніжаны.** Пра гэта турфірмам 8 мая паведамілі ў консульстве Балгарыі. Кошт візаў для дзяцей ад 6 да 12 гадоў будзе складаць 35 еўра. Дзеці векам да 6 гадоў атрымліваюць бясплатныя візы.

• **У Салігорскім раёне з-за сутыкнення з канём загінуў матацыкліст.** Гэта здарылася 9 мая на дарозе паблізу вёскі Ананчыцы Салігорскага раёна. 22-гадовы малады чалавек учыніў наезд на каня, які выбег на праезную частку ў непасрэднай блізкасці перад транспартным сродкам.

**ЗП, БелаПАН**

## ARCHE ў Гродне і Мінску




**20 мая (чацвер) у 19.00 у Гародні (вул.Будзённага, 48, пакой 69)** адбудзецца прэзентацыя тэматычнага нумара часопіса «ARCHE» «Другая Гародня» з удзелам яго ўкладальніка Юрыя Гардзеева, а таксама шматлікіх аўтараў.

Плануецца, што **21 траўня (пятніца) у 19.00 у Мінску (Гістарычная майстэрня, вул.Сухая, 25)** будзе прадстаўлены той самы нумар з удзелам Юрыя Гардзеева, а таксама спецпраект часопіса «ARCHE» «Хронікі і летапісы Беларусі: сярэднявечча і раннемадэрны час» з удзелам укладальніка Васіля Вароніна. Дакладна аб часе і месцы мінскай імпрэзы будзе паведамлена ў наступным нумары «Нашай Нівы».

На абедзвюх презентацыях можна будзе азнаёміцца з навінкамі беларускага кнігадрукавання.

Запрашаюцца ўсе ахвочыя. Мерапрыемствы пройдуць у рамках кампаніі «Будзьма».


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

ВГ., Фёдару П., З.Б., Мікалаю А., Уладзіміру Г., Наталлі Л., А.П., Т.П., Т.Т., Таццяне К., С.К., Валянціне Г., А.С., Г.К., Алене Л., А.С., З.А., Вікенцію М., Людміле М., Н.Ж., А.П., С.К., Марыі М., І.Л., С.Я., Р.М., Валерыі Н., Віктару Б., Н.Ш.,Івану К., А.Б., Ізмаілу А., Максіму В., Міхаілу К., Але К., А.Р., Ірыне Ц., Т.В., Б.С., Дзмітрыю Р., Аляксандру М., В.Ц., С.К., Л.Г., Міхаілу Ш., В.Н., А.Р., Юрыю Л., П., Я.Ш., Ігару С. з Мінска.

# Пяць гадоў за пяць патронаў

Працяг са старонкі 1.

Пракурор Эльдар Сафараў палічыў, што віна ўсіх падсудных даказаная. Ён запрасіў у суддзі вялізныя тэрміны для ўсіх абвінавачаных. Для Аўтуховіча — 20 гадоў зняволення, Ларыну і Асіпенку — па 11, для міліцыянта Міхаіла Казлова (які ведаў пра замах, але не данёс) — 3 гады.

Падтрымаць ваўкавысцаў да будынка суда прыйшло каля сотні людзей. Сярод іх былі пасол Швецыі Стэфан Эрыксан, намеснік кіраўніка офіса АБСЕ Жандос Асанаў, кандыдаты ў прэзідэнты Андрэй Саннікаў і Віталь Рымашэўскі, былы палітвязень Аляксандр Казулін, ветэраны афганскай вайны Алег Воўчак і Аляксандр Камароўскі, былы кіраўнік мар'інагорскага спецназа Уладзімір Барадач, прыехалі сваякі. Многія з прысутных мелі з сабой кветкі.

Суддзя Цяцюхін пачаў абвяшчаць не выніковую частку прысуду, а ўвесь прысуд цалкам, што заняло тры гадзіны. І на ўсеагульнае здзіўленне суддзя здымаў адно за другім абвінавачванні.

Найперш з Аўтуховіча знялі абвінавачванні ў падпалах дамоў, потым у замаху на Камянко і Саўчанку. На думку суддзі, следства не мела дастатковых доказаў віны Аўтуховіча. Часта абвінавачванне грунтавалася толькі на паказаннях Ларына, якія суд палічыў



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Людзі прыйшлі да будынка суда падтрымаць Аўтуховіча з яго партрэтамі і кветкамі.

непраўдзівымі.

Не знялі толькі абвінавачванне ў захоўванні зброі. У выніку Аўтуховіч быў асуджаны на пяць гадоў і два месяцы калоніі строгага рэжыму — за пяць патронаў. На кожны патрон па году.

Уладзімір Асіпенка і Аляксандр Ларын атрымалі па тры гады. А Міхаіл Казлоў — два. Ні ў каго не будзе канфіскаваная маёмасць.

Аўтуховіч, які сядзеў за кратамі ў кайданках, пасля абвяшчэння прысуду падняў угору счэпленыя ў замок рукі — зрабіў зале жэст удзячнасці за падтрымку.

Адвакат Павал Сапелка заявіў, што ацэньвае прысуд як «бяссілле ўладаў перад сумленным і чэсным чалавекам». Адзіным законным прысудам было б апраўданне, кажа П.Сапелка.

Праваабаронца Алег Воўчак мяркуе, што Асіпенка і Казлоў могуць апынуцца на волі па ўмоўна-датэрміновым вызваленні ўжо праз тры-чатыры месяцы. А Аўтуховіч — праз два гады.

Пасол Швецыі Стэфан Эрыксан кажа, што для яго важным з'яўляецца, што «знятыя найбольш цяжкія абвінавачанні. Тым не менш, пяць гадоў, мне здаецца, — гэта вельмі шмат».

З'явілася і першая міжнародная рэакцыя на прысуд. 8 мая пасольства ЗША прыняло заяву, дзе выказвае занепакоенасць рашэннем суда.

«Мы спадзяваліся, што беларускія ўлады выкарыстаюць гэтую магчымасць, каб прадэманстраваць выкананне належнай прававой працэдуры і незалежнасць судовай сістэмы. На жаль, існуюць прычыны сумнявацца ў належным правядзенні гэтага працэсу ў тым, што тычыцца грамадзянскіх правоў Мікалая Аўтуховіча і астатніх удзельнікаў працэсу», — адзначаецца ў заяве.

**Зміцер Панкавец**

# Пяць плюсаў і пяць мінусаў Віталя Рымашэўскага

Сустаршыня Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Віталь Рымашэўскі лічыць, што на гэты момант ён мае самыя вялікія шанцы стаць адзіным кандыдатам ад Беларускага незалежніцкага блока. «НН» працягвае аналізаваць слабыя і моцныя бакі імаверных кандыдатаў у прэзідэнты.

### 1. Партыя

**+** За Віталём Рымашэўскім стаіць падтрымка найбольш актыўнай на сённяшні дзень партыі — Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Таксама БХД змагла заручыцца падтрымкай «Маладога фронту», «Правага альянсу», руху «Разам». БХД актыўнічае, партыя распачынае новыя кампаніі (супраць алкагалізму, акультызму, абортаў, выміраня беларусаў, за сямейныя каштоўнасці), працуе з людзьмі. На мясцовых выбарах кандыдаты ад «хадэкаў» змаглі назбіраць каля 30 тысяч подпісаў. На прэзідэнцкіх жа, калі пастарацца, то можна пераадолець бар'ер у 100 тысяч.

**—** Тым не менш, хрысціянскія дэмакраты адпужваюць частку выбарцаў сваім празмерным рэлігійным радыкалізмам. У свецкай Беларусі, якая ўваходзіць у дзясятку самым нерэлігійных краін свету, такія ідэі не могуць займець шырокай падтрымкі. Сам Рымашэўскі — праваслаўны вернік. У сваім брацтве ён мае досыць вялікі аўтарытэт.

### 2. Новы чалавек

**+** Рэйтынг Мілінкевіча большы за рэйтынг Рымашэўскага. Але і адмоўны рэйтынг у лідэра Руху «За Свабоду» таксама большы. Рымашэўскі ў вялікай палітыцы чалавек новы. Ён нібы чысты аркуш, на якім яшчэ толькі трэба будзе зрабіць запісы. «Рымашэўскі глабальна мысліць, а дзейнічае лакальна», — кажа пра яго паплечнік Павел Севярынец.

**—** З 1996 года, калі Рымашэўскі прыйшоў у нацыянальны рух, ён змяніў нямала арганізацый. Спачатку быў у «Маладым фронце», потым у АГП, быў заснавальнікам Руху «За Свабоду», а цяпер вось прыйшоў у Беларускую хрысціянскую дэмакратыю. Такая нестабільнасць можа быць скарыстаная супраць Віталя. Праціўнікі будуць гаварыць, што гэты кандыдат бегае ад адной арганізацыі да іншай, дзе жывецца больш цёпла і сытна.

### 3. Агрэсіўнасць

**+** Рымашэўскі востры на язык. Ён не хавае сваіх эмоцый, кажа ўсё наўпрост. На любых перамовах сустаршыня БХД паводзіць сябе даволі агрэсіўна. Калі ён не згаджаецца з суразмоўцам, дык абавязкова выкажа гэта ўслых, трымаць фігу ў кішэні не будзе. Такія паводзіны часта дазваляюць палітыку дасягаць пастаўленых перад сабой мэтаў.

**—** Праз сваю рэзкасць Рымашэўскі перасвараны са значнай часткай апазіцыйных лідэраў. Яны адгукаюцца пра Рымашэўскага досыць скептычна. Можна часта пачуць, што Віталь проста «калоціць панты», хоць за ім нічога і няма. Апаненты таксама закідаюць лідэру «хадэкаў» празмерную ганарыстасць.

### 4. Матор

**+** Віталь Рымашэўскі ўвесь час у руху, ён вельмі актыўны, не можа знаходзіцца без дзеяння. Ён — матор многіх кампаній і акцый. Каліноўская рада «Маладога фронту» за час кіраўніцтва Рымашэўскага была самай шматлікай і актыўнай, яна налічвала больш за 150 чалавек, выдавала сваю газету, праводзіла папулярныя дыскатэкі. Не змяніўся ў гэтым плане Віталь і ў БХД. Ён умее настройваць людзей на працу, даваць ім патрэбны імпульс.

**—** Праз такую вось актыўнасць нярэдка здараецца, што Рымашэўскі трапляе не ў самыя прыгожыя гісторыі. Чаго толькі варты выпадак на Антыкамуністычным форуме, калі Рымашэўскі зрабіў на падлозе ходнікі са свежых нумароў недзяржаўнай газеты «Таварыш». Беларуская асацыяцыя журналістаў тады асудзіла ўчынак Рымашэўскага.

### 5. Сем'янін

**+** У Рымашэўскага прыгожая і моцная сям'я. На перадвыбарчых плакатах разам з жонкай і дачкой ён глядзецца б вельмі добра. Маладосць і азарт — гэта плюсы Рымашэўскага.

**—** Маючы ўжо 35 гадоў, Рымашэўскі яшчэ нідзе толкам не працаваў. «Ведаеце, калі чалавек у сваім жыцці не працаваў, не зарабляў грошы нармальнай працай, не кіраваў хаця б дзясяткам ці паўсотняй людзей, дык ісці кіраваць краінай — гэта смех і блазенства», — выказаўся пра Рымашэўскага першы кіраўнік незалежнай Беларусі Станіслаў Шушкевіч.

**ЗП**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Віталь Рымашэўскі**

нарадзіўся ў 1975 у Бабруйску. Скончыў БНТУ па спецыяльнасці «інжынер–будаўнік». Прафесійна займаецца палітыкай з 1996 — тады ён стаў членам каардынацыйнага савета арганізацыі «Беларускае аб`яднанне маладых палітыкаў». У 2005—2006 — каардынатар перадвыбарнай кампаніі Аляксандра Мілінкевіча па Фрунзенскім раёне Мінска. У 2006 стаў заснавальнікам БХД. Жанаты, мае дачку.

# Снягір у клетцы на сем гадоў

Ва ўмовах інфармацыйнага вакууму на мінулым тыдні быў абвешчаны прысуд былому пракурору Мінскай вобласці Міхаілу Снегіру. За кратамі пракурор ад лістапада 2008 года, а працэс за зачыненымі дзвярамі пачаўся яшчэ ў жніўні летась. За гэты час было дапытана больш за 130 сведак.

Снягір быў арыштаваны за незаконнае набыццё элітнай кватэры, будаўніцтва катэджа на Цнянцы, атрыманне хабару, а таксама падбухторванне суддзі да прыняцця прымальных для сябе рашэнняў.

У выніку Міхаіл Снягір асуджаны на сем гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці.

Па абвяшчэнні прысуду Снягір паспеў заявіць СМІ: «Ганьба! Гэта мафія, якая мяне пераследавала, схавала сюды. Нават апошні нацельны крыжык адабралі. Забралі кватэру, закрэслілі ўсё, што зрабіў для дзяржавы за 30 гадоў працы. Дзякуй дзяржаве, што гэтак ацаніла маю працу заслужанага юрыста і гэтак далей».

З турмы Снягір накіроўваў некалькі лістоў да Аляксандра Лукашэнкі, просячы літасці. У сваіх бедах ён абвінавачваў старшыню дзяржкантролю Зянона Ломацяа.

**ЗП**

## Сцісла

**• Мядзведзеў і Януковіч з георгіеўскімі стужкамі, Лукашэнка — з чырвоназялёнай.** 8 мая Аляксандар Лукашэнка ўзяў удзел у адкрыцці мемарыяла ў Маскве. Кіраўнікі Беларусі, Расіі і Украіны прыехалі на імпрэзу на адным «Мерсэдэсе», на антэне якога была завязаная георгіеўская стужка. Такія самыя стужкі былі і на пінжаках Мядзведзева і Януковіча, а вось у Лукашэнкі была чырвоназялёная. Падчас сустрэчы з ветэранамі прэзідэнты выпілі па сто грамаў гарэлкі. А калі Лукашэнка выцер твар хусцінкай, Мядзведзеў у яго спытаў: «Што, ніяк не можаце акліматызавацца?»

**• Сустрэча з кіраўніком Еўрапейскай народнай партыі.** У Вільні з Вільфрыдам Мартэнсам сустрэліся Аляксандр Мілінкевіч, Віталь Рымашэўскі, Аляксей Янукевіч і Анатоль Лябедзька. Гаворка ішла пра прэзідэнцкія выбары і вылучэнне адзінага кандыдата ад апазіцыі. БХД прэзентавала свой праект, а БНФ і Рух «За Свабоду» паабяцалі сфармуляваць свае прапановы да канца тыдня.

**• Бішкек не будзе патрабаваць выдачы Бакіева.** «Народы Кыргызстана і Беларусі перажывуць пытанне Курманбека Бакіева, і гэта ніякім чынам не адаб'ецца на нашых адносінах», — заявіў кіраўнік апарата часовага ўрада Кыргызстана Эдыль Байсалаў, каментуючы заяву Лукашэнкі, што Беларусь не выдасць Кыргызстану Бакіева.

**ЗП**

# Еўраапакаліпсіс адмяняецца

Члены ЕС могуць разлічваць на гіганцкія антыкрызісныя фонды.

Скачок еўра на мінулым тыдні дадаў сівых валасоў тым, хто адкладвае грошы выключна ў еўрапейскай валюце. Фінансавы крызіс у Грэцыі цягнуў валюту на дно, і еўра дзень за днём абнаўляў гадавыя мінімумы ў адносінах да даляра, дайшоўшы ў рэшце рэшт да 1,25.

Дарэчы, за кошт адначасовага падзення еўра і расійскага рубля валютны кошык апусціўся да паказчыкаў канца 2009 года. Гэта значыцца, што апошнім часам у краіне назіралася рэвальвацыя — падаражанне нацыянальнай валюты. За чатыры з паловай месяцы беларускі рубель апусціўся ўсяго на 0,14%.

Сітуацыя карэнным чынам змянілася раніцай у панядзелак. Пасля 12-гадзінных перамоў у Брусэлі міністры фінансаў краін Еўрасаюза дамовіліся нарэшце стратэгіі ратавання еўра. Было заключана пагадненне аб стварэнні спецыяльнага антыкрызіснага фонду памерам 750 мільярдаў еўра.

440 мільярдаў ад гэтай сумы дадуць самі краіны еўразоны, прычым найбольшы цяжар — 123 мільярды — ляжа на плечы Германіі. Кожны плацёж павінен будзе ратыфікаваць парламент краіны, якая выдае грошы, што можа знізіць аператыўнасць дапамогі. Яшчэ 60 мільярдаў згадзілася даць Еўракамісія. Нарэшце, апошнія 250 млрд падкіне Міжнародны валютны фонд. Падсумоўваючы, міністр фінансаў Іспаніі Алена Сальгада пафасна зазначыла: «Мы будзем бараніць еўра любой цаной!»

Біржы неадкладна адрэагавалі на навіны. Еўра перайшоў мяжу 1,3 даляра і як мінімум бліжэйшыя час яму нічога не пагражае.

Тым часам беларусы кінуліся скупляць еўра. У панядзелак у краіне быў афіцыйны выхадны дзень, таму Нацбанк не змог адрэагаваць на падаражанне еўра. Курсы валют засталіся старымі, выстаўленымі яшчэ ў пятніцу. Танны еўра прывабіў шмат каго з мінчан. Еўрапейскую валюту ў вялікай колькасці складана было купіць у абменніках у цэнтры сталіцы.

**Яўген Васількоў**

## СціСла

**• Каля рыбакомплексу збудуюць спа-гатэль.** Ён з'явіцца на тэрыторыі коннаспартыўнага комплексу «Ураджайны» ў вёсцы Сенніца Мінскага раёна ў 2012 годзе. Усе неабходныя для пачатку будаўніцтва дакументы ўжо падпісаныя, і ў найбліжэйшы час падрадная арганізацыя павінна прыступіць да ўзвядзення аб'екта. Спа-гатэль плануюць пабудаваць на працягу двух гадоў. Фінансаваць праект будзе эстонскімі інвестарамі.

**• У Мінску з'явілася першая аўтаматызаваная АЗС.** На новай запраўцы на Партызанскім праспекце, 156а кіроўцы змогуць абысціся без аператара, каб замовіць паліва, заплаціць за яго і заліць у бак. Касіра заменіць спецыяльны тэрмінал, размешчаны ў двух метрах ад калонак.

**• «Маяк Мінска» «ўсох» больш чым на 40 паверхаў.** Будынак «Маяк Мінска» каля Нацыянальнай бібліятэкі будзе ўсяго толькі 35-павярховым. Раней меркавалася, што маяк вырасце ажно на 78 паверхаў, але як і большасць іншых праектаў з часам ён змяніў аблічча. На самым версе размесціцца рэстаран, а ніжэй — адміністрацыйна-дзелавы цэнтр, гасцініца, апартаменты для пражывання, гандлёва-забаўляльны цэнтр і аквапарк.

**• Чэхію цікавіць беларуская АЭС.** Дарадца міністра прамысловасці і гандлю Чэхіі Ян Гронік заявіў, што яго краіна прапанавала Беларусі свой удзел у будаўніцтве АЭС. Чэхія можа быць субпастаўшчыком, але «гэта не толькі пастаўка абсталявання, але ў нас таксама вялікі навукова-тэхнічны патэнцыял», — мяркуе чэх.

**• Апошняе месца ў СНД па росце ВУП.** У першым квартале ВУП Беларусі падняўся на 4%, але гэтага хапіла толькі на апошняе месца ў СНД па тэмпах росту. Самы высокі рост эканомікі зафіксаваны ў Кыргызстане, дзе ВУП павялічыўся на 16,4%.

**• Стаўка рэфінансавання — 12%.** З 12 траўня Нацбанк змяншае стаўку рэфінансавання яшчэ на паўпрацэнта. Услед за гэтым паменшацца крэдыты, але і ўклады таксама.

**ЯВ**




PHOTO.BYMEDIA.NET

**Скончылася рэканструкцыя мінскага піўзавода «Крыніца», якая агулам каштавала 306 млрд рублёў. Магутнасць завода пасля гэтага вырасла да 24 млн дал. у год. На фота: генеральны дырэктар прадпрыемства Рыгор Пяткевіч.**

# Прадаваць машыны можна будзе раз на тры гады?

Беларусь прапанавала Мытнаму саюзу кампрамісны варыянт.

Мыты на ўвоз у Беларусь патрыманых аўтамабіляў фізічнымі асобамі могуць не павысіцца. Ці то відавочная народная незадаволенасць, ці то проста жаданне пайсці на прынцып і не зрабіць так, як хоча Расія, прымусілі беларускую ўладу шукаць альтэрнатыўнае рашэнне.

Згодна з новай канцэпцыяй, мыта на імпартаваныя аўтамабілі для фізічных асоб у Беларусі захаваецца на цяперашнім узроўні, але з правам продажу машыны раз на тры гады. Гэта значыцца, што тыя, хто гоняць машыну з-за мяжы выключна для сябе, змогуць жыць па ранейшых правілах. Калі нехта пажадае прадаваць машыны часцей, то будзе вымушаны выплаціць мыта па такой стаўцы, як для юрыдычных асобаў — нашмат вышэйшай.

Такая прапанова зараз абмяркоўваецца краінамі-ўдзельніцамі Мытнага саюза і будзе разглядацца 21 траўня на ўзроўні кіраўнікоў урадаў на пасяджэнні Міждзяржаўнай рады ЕўраАзЭС. Дзяржаўны мытны камітэт плануе ўрэгуляваць яго ўжо ў траўні, сыходзячы з інтэнсіўнасці перамоваў.

Нагадаем, пакуль у Беларусі фізічная асоба могуць завезці аўтамабіль з выплатай паніжаных ставак мыта раз на год.

Перагоншчык Андрэй П. каментуе прафесійнае бачанне сітуацыі: «Цэны істотна не зменяцца. Проста будзем працаваць трошкі па іншай схеме. На таго, хто будзе афармляць і пераганяць машыну, дастаткова будзе аформіць даверанасць. Іншая рэч, што можа спасці ажыятаж вакол аўтарынку. Па-першае, з'явілася заслона на шляху машын у Расію, па-другое, людзі ўбачылі, што ў бліжэйшы час сітуацыя прынцыпова не зменіцца, а таму адкладуць пакупку новых аўто».

**ЯВ**

# З уласнікаў катэджаў патрабуюць 100% «камуналкі»

Беларусь мае сваё разуменне падатку на раскошу.

Згодна з усімі інструкцыямі Міжнароднага валютнага фонду, краіна пачынае адмаўляцца ад перакрыжаванага фінансавання. Цяпер кожны плаціць за сябе. Рэформу ЖКГ вырашана апрабаваць на ўладальніках катэджаў. Менавіта яны першымі пачнуць выплачваць 100% камунальных паслуг.

Новы парадак зацверджаны пастановай Саўміна № 639 ад 28 красавіка. У адпаведнасці з ім, з 1 чэрвеня гэтага года жыхары сядзібных жылых дамоў павышанай камфортнасці будуць плаціць за камунальныя паслугі па тарыфах, «якія забяспечваюць поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат на аказанне гэтых паслуг». Што лічыцца дамамі павышанай камфортнасці? Гэта сядзібныя жылыя дамы (ці кватэры ў «блакаваных жылых дамах») агульнай плошчай больш за 200 квадратных метраў з гарачым водазабеспячэннем, каналізацыяй, ацяпленнем і вентыляцыяй, электрычнасцю, абсталяваныя газавымі або электрычнымі плітамі. Гаворка ідзе пра дамы, размешчаныя ў Мінску і яго прыгарадах, у абласных гарадах і прылеглых да іх адміністрацыйных раёнах, раённых цэнтрах.

Акрамя таго, цяпер на дзярждатацыі на аплату тэхабслугоўвання і ацяплення не змогуць разлічваць грамадзяне, ва ўласнасці або ў карыстанні ў якіх ёсць адно або некалькі жылых памяшканняў пры адсутнасці ў іх зарэгістраваных жыхароў — наймальніка, уласніка, сябра арганізацыі забудоўшчыкаў або членаў іх сем'яў. Гэта рашэнне датычыцца і юрасобаў, на балансе якіх ёсць пустыя жылыя памяшканні.

Ацаніць, у колькі жыхарам катэджаў зараз абыдзецца камуналка, пакуль можна толькі прыблізна: ім прыйдзецца кампенсаваць 100% выдаткаў, а ў цэлым па краіне беларусы кампенсуюць толькі каля 30% выдаткаў.

Камунальны наўрад ці падаражэюць утрая — большасць катэджаў мае ўласнае водазабеспячэнне і каналізацыю, таму прыйдзецца плаціць больш толькі за электрычнасць і газ.

Разам з тым, гэтае падаражанне камунальных паслуг не адмяняе іншае, запланаванае на канец ацяпляльнага сезона, якое, у сваю чаргу, ахопіць увесь жылы фонд.

**ЯВ**

# «За 25 год лётнай практыкі я такога страшнага выпадку не бачыў»

**Відавочцы: у часе парада над Нямігай ледзь не сутыкнуліся вайсковыя самалёты.**

Пасля парада на Дзень Перамогі на адным з беларускіх авіяфорумаў з'явілася паведамленне відавочцы пралёту вайсковай авіяцыі. Ён пісаў, што стаў сведкам таго, як у небе ледзь не сутыкнуліся Су-24 і Л-39. Хутка інфармацыя пра гэты інцыдэнт пачала расці як снежны ком. Сталі з'яўляцца фотаздымкі і відэа.

Відавочцы сцвярджалі, што чацвёрка Су-24 пры падлёце да праспекта Пераможцаў рассыпалася, адзін з самалётаў адарваўся ад шыхта і нібыта з цяжкасцю размінуўся з жылым домам. Адбылося гэта акурат над натоўпам гледачоў.

У гэты момант над Су-24 перпендыкулярным курсам праляцела група самалётаў Л-39. Гэтыя словы пацвярджаюцца відэаролікамі, зробленымі з розных кропак. Відавочцы падзеі гавораць пра стварэнне аварыйнай сітуацыі, якая магла прывесці да трагедыі. Многія ўзгадваюць катастрофу Су-27 у Львове ў 2002 годзе ды ставяць пад сумнеў неабходнасць правядзення над горадам маштабных авіяшоў.


ONLINER.BY

### «Без нюансаў і хібаў»

У панядзелак 10 мая прэс-сакратар Міністэрства абароны Вячаслаў Раменчык пракаментаваў гэтую інфармацыю: «Не ў маіх правілах каментаваць глупствы, кімсьці прыдуманыя. Увесь пралёт паветранага эшалона быў праведзены ў адпаведнасці з заданнем, без якіх-небудзь нюансаў і хібаў. Лётчыкі цалкам выканалі задачу».

Інтэрнэт-супольнасць сустрэла гэтую заяву ў штыхі, прыгадаўшы ведамству няўдалыя спробы замаўчаць іншы выпадак з вайсковай тэхнікай у Мінску, які адбыўся 6 мая. Тады ў раёне плошчы Бангалор у часе прахождання вайсковай калоны загарэлася адзінка спецтэхнікі. Фота і відэа здарэння шырока разышліся па сеціве, аднак на наступны дзень прэс-служба Мінабароны заявіла, што «тэхніка Узброеных сілаў, што ўдзельнічала вечарам шостага мая ў генеральнай рэпетыцыі вайсковага парада ў Мінску, не гарэла».

### «Гэта была супераварыйная сітуацыя»

Лётчык I класа, палкоўнік ваеннай авіяцыі ў запасе Юрый Панамарэнка на просьбу «НН» прааналізаваў чатыры відэаролікі, зробленыя з розных кропак 9 мая ў Мінску.

«Я яшчэ ў жыцці за 25 каляндарных год лётнай практыкі такога страшнага выпадку не бачыў», — рэзюмаваў прагляд палкоўнік запасу.

Ён вызначыў некалькі ключавых момантаў на відэа: самалёты ляцелі занадта нізка, улічваючы, што іх маршрут пралягаў над жылым масівам і натоўпам гледачоў, гэта было празмерна рызыкоўна і неабгрунтавана. Небяспечным, на думку палкоўніка, было і тое, што курс чацвёркі Су-24 перасекся з курсам групы Л-39.

«Гэта была супераварыйная сітуацыя. Маглі загінуць тысячы чалавек». Па назіраннях Юрыя Панамарэнкі, дзеянні пілота Су-24, які на відэа адкалоўся ад групы, выглядалі няўпэўненымі. Палкоўнік запасу выказаў думку, што з'яўленне на маршруце «сушак» групы Л-39 магчыма было нечаканасцю для пілотаў бамбавікоў, таму іх шыхт і рассыпаўся. На пытанне, што адчувае пілот у такія моманты, ён адказаў, што пілот востра адчувае небяспеку, але не ведае, што рабіць, бо любое дзеянне можа толькі ўскладніць справу. «Мне падаецца, што тут яны не сутыкнуліся на авось, цудам не сутыкнуліся».

Палкоўнік запасу расказаў пра групавыя палёты. Групавая злётанасць — надзвычай складаны элемент, пры выкананні якога вельмі важна трымаць так званую каробачку. «Самалёт не прызнае ні чыноў, ні рангаў, ні лампасаў. Гэтаму вучаць у лётных вучэльнях», — кажа лётчык.

Ён прыгадаў апошнія авіякатастрофы ў Расіі, у якіх гінулі пілоты найвышэйшага класа, а таксама трагедыю на авіяшоу ў Львове ў 2002 годзе. Юрый Міхайлавіч мяркуе, што ўдзел у парадзе ваеннай авіяцыі з узроўнем падрыхтоўкі, прадэманстраваным 9 мая 2010 года, рана ці позна можа прывесці да трагедыі.

**Сямён Печанко, Алесь Кудрыцкі**


АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

**Юры Міхайлавіч Панамарэнка**

72 гады. Нарадзіўся ў Башкірыі. Скончыў лётную вучэльню ў Чарнігаве, Ваенна–паветраную акадэмію імя Гагарына ў Маскоўскай вобласці. Быў начальнікам штаба палка супрацьпаветранай абароны ў Мачулішчах, першым намеснікам камандзіра часці, старшым інспектарам СПА Аб'яднаных узброеных сілаў Варшаўскай дамовы. Лётчык I класа, палкоўнік запасу. Лётная практыка — 25 каляндарных год. Лятаў на Су–9, МіГ–25.



**Су-24**

Франтавы бамбавальнік, прызначаны для нанясення ракетна–бомбавых удараў у простых і складаных метэаўмовах, удзень і ўначы, у тым ліку на малых вышынях з прыцэльным паражэннем наземных і надводных цэляў. Першы палёт — 1970 г., паступіў на ўзбраенне — 1975 г. Су–24 лічыцца дастаткова складанай для пілатавання машынай і мае высокі ўзровень аварыйнасці. Толькі ў часе лётных выпрабаванняў было страчана 14 Су–24 і Су–24М. Пасля прыняцця самалёта на ўзбраенне штогод адбывалася 5–6 аварый і катастроф. У 1998 г. быў прызнаны найбольш аварыйным лятальным апаратам расійскай ваеннай авіяцыі.

## На пажары ў Мінску загінулі чатыры выратавальнікі

**Чатыры супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях загінулі падчас ліквідацыі пажару на тэрыторыі Мінскага завода вылічальнай тэхнікі, дзе раніцай 11 мая гарэў склад, што арандуецца ў прадпрыемства.**


ONLINER.BY

Пажар пачаўся ў 9.05. У 9.50 падчас яго ліквідацыі абваліўся дах. Пад заваламі апынуліся сем супрацоўнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Усіх пацярпелых дасталі з-пад завалаў. «Двое з іх памерлі на месцы пры правядзенні рэанімацыйных мерапрыемстваў, яшчэ двое — у бальніцы. Зараз яшчэ трое супрацоўнікаў знаходзяцца ў бальніцы», — паведаміў прэс-сакратар Міністэрства Віталь Навіцкі.

У 10.08 пажар быў лакалізаваны, а ў 11.38 ліквідаваны. У тушэнні пажару на плошчы каля 200 квадратных метраў былі задзейнічаныя 105 чалавек і 25 адзінак тэхнікі МНС.

На месца пажару прыбыў пракурор Мінска Мікалай Кулік. Вырашаецца пытанне пра завядзенне крымінальнай справы.

Імёны загінулых — Вадзім Лесік (1977 года нараджэння, жанаты, двое дзетак), Дзмітры Лоўдар (1975, жанаты, адно дзіця), Андрэй Мухін (1969, жанаты, двое дзяцей) і Юры Сысой (1978, жанаты, адно дзіця).

**БелаПАН**

## Ствараецца Інстытут памежнай службы

Інстытут пагранічнай службы ствараецца на базе памежнага факультэта Ваеннай акадэміі. Адпаведны ўказ №237 Аляксандр Лукашэнка падпісаў 5 мая.

Такое рашэнне прынятае ў мэтах удасканалення кадравага забеспячэння органаў памежнай службы.

Інстытут будзе ўваходзіць у сістэму органаў памежнай службы і з'яўляцца юрыдычнай асобай. Падпарадкоўвацца ён будзе Дзяржаўнаму памежнаму камітэту, старшыня якога зацвярджае кольказсць, структуру і штат інстытута ў межах агульнай колькасці органаў пагранічнай службы і расходаў на іх утрыманне.

Цікава, што яшчэ зусім нядаўна хадзілі размовы пра аб'яднанне памежнага камітэта з КДБ. Прыхільнікі такога варыянта ківалі ў бок Расіі, дзе пагранічнікі страцілі сваю незалежнасць.

Стварэнне ўласнага інстытута ўзмацняе пазіцыі памежнікаў.

**ЗП**

## Ярмошына не адпачне нават у Чарнагорыі

Да візавых санкцый Еўрасаюза ў дачыненні да беларускіх чыноўнікаў далучыліся яшчэ восем краін. Брусэль прывітаў гэтае рашэнне Албаніі, Босніі і Герцагавіны, Ісландыі, Ліхтэнштэйна, Македоніі, Нарвегіі, Харватыі і Чарнагорыі.

На сённяшні дзень у спіс невыязных уваходзяць пяць чалавек: старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына, былыя міністры ўнутраных справаў Уладзімір Навумаў і Юры Сівакоў, былы кіраўнік Рады бяспекі Віктар Шэйман і экс-камандзір уручанскага спецназа Дзмітры Паўлічэнка.

Ярмошынай уезд на тэрыторыю ЕС забаронены па прычыне фальсіфікацыі выбараў. Чацвёра астатніх падазраюцца ў датычнасці да знікненняў у краіне вядомых палітыкаў і журналістаў.

У поўным спісе невыязных яшчэ 36 прозвішчаў, улучна з Аляксандрам Лукашэнкам. Алеў кастрычніку 2008 года Еўрасаюз вырашыў часова прыпыніць санкцыі.

**ЗП**

# Перамалёўваючы карту

Еўрапейская карта — састарэлая і нелагічная. Вось як яна мусіць выглядаць. Жартуе часопіс The Economist.

Людзі, якім надакучылі суседзі, могуць пераехаць жыць у іншы раён. А краіны не могуць. Але дапусцім, што было б, калі б яны маглі. Калі карту Еўропы перабудаваць, жыццё стане больш лагічным і прыемным.

Вялікабрытанія, якая пасля ўсеагульных выбараў будзе вымушаная зірнуць у вочы жахліваму дэфіцыту дзяржаўнага бюджэту, павінная наблізіцца да краін Паўднёвай Еўропы, якія апынуліся ў аналагічным становішчы. Яе трэба адбуксіраваць да Азорскіх астравоў. (Калі па дарозе яе растрасе, з’явіцца добрая магчымасць размясціць Уэльс і Шатландыю на асобных выспах.)

На месца Вялікабрытаніі варта змясціць Польшчу, якая дастаткова пацярпела, знаходзячыся паміж Расіяй і Германіяй, і заслугоўвае таго, каб атрымліваць асалоду ад бадзёрых вятроў Паўночнай Атлантыкі і быць абароненай морам ад усіх патэнцыйных захопнікаў.

Незразумелыя фламандска-французскія моўныя спрэчкі ў Бельгіі вельмі нагадваюць Цэнтральную Еўропу ў найгоршым сэнсе, асабліва тую лухту, якую Славакія прыдумляе для сваёй венгерскамоўнай этнічнай меншасці. Таму Бельгія павінная памяняцца месцамі з Чэхіяй. Флегматычныя, добра арганізаваныя чэхі выдатна пасябруюць са сваімі новымі суседзямі — нідэрландцамі, і наадварот.

Беларусь, якая цяпер не мае выхаду да мора і спрабуе выпаўзці з-пад расійскага бота, значна выйграе ад уплыву скандынаўскага рэгіёна — балтыйскім краінам гэта вельмі дапамагло пазбавіцца ад савецкай спадчыны. Значыцца, Беларусі трэба рухацца на поўнач да Балтыйскага мора і заняць месца Эстоніі, Латвіі і Літвы.

Тры апошнія краіны мусяць дыслакавацца дзесьці каля Ірландыі. Як і Смарагдавы востраў, яны будуць вымушаныя змірыцца з суровай неабходнасцю «ўнутранай дэвальвацыі», аднаўленнем канкурэнтаздольнасці за кошт скарачэння заробкаў і цэнаў замест таго, каб абраць лёгкі шлях абясцэньвання грошай або неразважлівых пазыкаў, як Грэцыя. Прыбалтыка будзе шчаслівая, знаходзячыся далей ад Расіі і бліжэй да Амерыкі. Сярод іншага, Калінінградскую вобласць можна зрушыць уверх па ўзбярэжжы ў бок Расіі, паклаўшы канец яе ненармальнаму статусу спадчыннага анклава Другой сусветнай вайны і папярэдзіўшы любыя магчымыя ў будучыні інтрыгі Расіі, што датычацца чыгуначнага транзіту.

Месца, вызваленае Польшчай і Беларуссю, мусяць заняць заходняя і цэнтральная часткі Украіны. Германія, якой будзе да ўкраінскай мяжы толькі 100 кіламетраў ад Берліна, зможа ўрэшце сур’ёзна паспрыяць інтэграцыі Украіны з Еўропай. Перамяшчэнне Украіны дазволіць Расіі пасунуцца на захад і поўдзень, каб вызваліць Сібір для кітайцаў, якія яе ўсё адно рана ці позна зоймуць.

Таксама варта крыху пераўпарадкаваць Балканы. Македоніі, Албаніі і Косаву трэба перагрупавацца, каб Македонія заняла месца Косава побач з Сербіяй, Косава пераехала на ўзбярэжжа на месца Албаніі, а Албанія перамясцілася ў сярэдзіну краіны. Паранаідальныя фантазіі грэкаў пра тэрытарыяльныя прэтэнзіі з боку падманутых славянскіх ірэдэнтыстаў знікнуць. Боснія занадта кволая для перамяшчэння, таму хай застаецца на месцы.

Швейцарыю і Швецыю часта блытаюць. Таму мае сэнс Швейцарыю перамясціць на поўнач, дзе яна добра стане побач са скандынаўскімі краінамі.

Яе нейтралітэтам будуць цалкам задаволеныя фіны і шведы, а Нарвегія будзе радая мець у суседзях іншую краіну (а не Расію), што не ўваходзіць у ЕС.

Германія можа заставацца там, дзе ёсць, як і Францыя. Але Аўстрыю можна перасунуць на захад, на месца Швейцарыі, дазволіўшы Славеніі і Харватыі таксама рухацца на паўночны захад. Яны могуць злучыцца з паўночнай Італіяй у новы рэгіянальны саюз (які ў ідэале мусілі б кіраваць венецыянскія дожы). Астатняя частка Італіі, на поўдзень ад Рыма, аддзеліцца і аб’яднаецца з Сіцыліяй у новую краіну, якая афіцыйна будзе называцца Каралеўства Абедзвюх Сіцылій (мянушка — Бардэль). Гэтая краіна зможа стварыць фінансавы саюз з Грэцыяй, але больш ні з кім.




Беларусь, якая цяпер не мае выхаду да мора і спрабуе выпаўзці з-пад расійскага бота, значна выйграе ад уплыву скандынаўскага рэгіёна — балтыйскім краінам гэта вельмі дапамагло пазбавіцца ад савецкай спадчыны. Значыцца, Беларусі трэба рухацца на поўнач да Балтыйскага мора і заняць месца Эстоніі, Латвіі і Літвы.

# Эстонская палітык зняласе аголенай

Палітычная дзяячка, былы дэпутат парламента, а сёння палітычны аналітык, 28-гадовая Анна-Марыя Галаян зняласе аголенай для часопіса Playboy.




А днямі шатландская версія таблоіда The Sun назвала Анну-Марыю адной з самых сэксуальных палітыкаў у сусветным рэйтынгу ды апублікавала яе адкрытае фота з часопіса Playboy на першай паласе.

«Я як жанчына прымаю гэта ў якасці кампліментa», — пракаментавала Галаян свой чарговы «тытул». Паводле яе словаў, сэксуальнасць няважная для палітыка, прынамсі, у сусветным маштабе: куды важнейшыя адукацыя, веды і досвед. «На жаль, у Эстоніі пакуль не ўмеюць шанаваць усе гэтыя якасці», — пашкадавала Галаян.

Сваім прыкладам сярод палітыкаў Анна-Марыя назвала Уінстана Чэрчыля.

**DzD.ee**

## Здарэнні сцісла

• **Прайграў 14 тысяч даляраў і спакусіўся на сумку з салам.** 35-гадовы ўраджэнец Грузіі прыехаў у Гомель купляць бытавую тэхніку. Грошы яму далі сваякі. У Гомелі ён зайшоў у казіно і за вечар прайграў усе грошы. У тралейбусе грузін заўважыў, паводле яго слоў, жанчыну рэспектабельнага выгляду і падумаў, што ў яе могуць быць з сабой грошы. Ён ішоў за ёй да пад’езда, і калі яна ўваходзіла ў ліфт, вырваў у яе сумачку. Аднак, уцякаючы, спатыкнуўся і ўпаў. Яго затрымалі жыхары дома і перадалі міліцыі. У сумачцы была парфума, мабільнік і два кілаграмы свінога сала. Суд даў рабаўніку шэсць месяцаў арышту.

• **Забіў жонку, бо не давала развод.** 29-гадовы жыхар Косава (Івацэвіцкі раён) задушыў 30-гадовую жонку ў салоне іх аўтамабіля, вывез за горад і, прывязаўшы да цела жалезіну, утапіў у меліярацыйным канале. Паводле яго слоў, прычынамі забойства сталі пастаянныя канфлікты з жонкай, яе папрокі і нязгода скасаваць шлюб, чаго ён патрабаваў. У сям’і двое дзяцей: 10-месячны хлопчык і сямігадовая дзяўчынка.

• **Пацыент раённай бальніцы ў Ляхавічах выпаў з чацвертага паверха.** Ён загінуў. Папярэдняя версія прычынаў здарэння — самагубства. Мужчына 1959 г.н. нідзе не працаваў. На момант трагедыі ляжаў у тэрапеўтычным аддзяленні. Спіртным не злоўжываў.

• **У Маскве загінулі два гастарбайтары з Беларусі.** Адбылося гэта падчас аўтааварыі. Людзі былі з Ганцавіцкага раёна. У аднаго з загінулых сіротамі засталіся двое дзяцей, у другога — дачка. Штогод у Расію на заробкі выязджаюць сотні ганцаўчан, амаль кожны год нехта з іх там гіне.

• **У Пінску затрымалі педафіла.** Па падазрэнні ва ўчыненні распусных дзеянняў у адносінах да малалетняй дзяўчынкі затрыманы 43-гадовы мужчына. Ён падманам пранік у кватэру, дзе была адна 10-гадовая дзяўчынка. Пасля злачынства мужчына ўцёк. Дзяўчынка расказала пра гэта маці, якая звярнулася ў міліцыю. Па гарачых слядах падазронага затрымалі.

• **П’яны электрык збіў святара.** 88-гадовы праваслаўны святар, настаяцель храма Прасвятой Багародзіцы ў Мёрах, айцец Мікалай Рундо пацярпеў ад п’янага дзецюка. 40-гадовы электрык прыехаў з Віцебска ў Мёры — ладзіць праводку ў аптэцы. У першы ж дзень ён моцна напіўся ды заблукаў у незнаёмым горадзе. У дом да святара пагрукаў, каб спытаць дарогу. Але, пабачыўшы святара, чамусьці раззлаваўся і пачаў лаяцца на старога, а потым адабраў у таго кіёк і моцна збіў. Святар трапіў у лякарню з траўмай галавы, а электрык — у пастарунак. Міліцыя пачала крымінальную справу.

• **Муж застрэліў палюбоўніка жонкі.** Здавалася б, усё было добра ў сям’і 53-гадовага брыгадзіра трактарнай брыгады з Любанскага раёна, які ажаніўся са сваёй падначаленай — 35-гадовай запраўшчыцай трактарнай тэхнікі. Аднак летась ён даведаўся пра здраду жонкі з яго падначаленым — 35-гадовым трактарыстам. Адбывалася ўсё, як у класічным любоўным трохкутніку: сваркі, сыход з дому, просьбы спыніць сувязь і, нарэшце, пагрозы забойствам, якія рэалізаваліся 30 красавіка. Падмануты муж, узяўшы з сабой абрэз паляўнічай стрэльбы, прыехаў у вёску, дзе жыў супернік, і стрэліў з абрэза яму ў жывот. Той памёр на месцы.

**Паводле СМ; БелаПАН; «Еўрарадыё»**

# Рэваншысты, альбо Сустрэчны пазоў праз 20 гадоў

Піша **Віталь Тарас**.

Днямі ў Запарожжы каля будынка мясцовага абкама Кампартыі Украіны адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка Сталіну. Ад спёкі некалькі ветэранаў вайны страцілі прытомнасць. Адна пенсіянерка сканала ў шпіталі. Так Сталін, дакладней ягоны прывід у выглядзе каменнага ёлупа, як бы жартам забраў яшчэ адно жыццё. Да мільёнаў бязвінна закатаваных дадалася яшчэ адна ахвяра.

### Яны вяртаюцца?

Магчыма, гэты эпізод не заслугоўваў бы вялікай увагі. Але ўразіла адна дэталь. Помнік правадыру ўзводзіўся на прыватныя ахвяраванні камуністаў і ветэранаў вайны. І самы вялікі ўнёсак у 50 тысяч грыўняў — палову ўсіх грошай на будаўніцтва — зрабіў 84-гадовы жыхар Харкава Іван Шахаўцоў. Той самы Шахаўцоў, які больш за дваццаць гадоў таму праславіўся на ўвесь Савецкі Саюз. Але не тым, што ваяваў на фронце і стаў кавалерам ордэна Славы.

У 1988 годзе ён падаў у суд на газету «Советская культура» і на Алеся Адамовіча.

Беларускі пісьменнік і публіцыст (таксама ўдзельнік вайны) надрукаваў нататку пра следчага дзяржбяспекі па прозвішчы Хват, які катаваў на допытах акадэміка Мікалая Вавілава. У газетнай нататцы згадваўся нейкі «харкаўскі ваенны пракурор», які рассылаў паўсюль лісты ў абарону Хвата. Шахаўцоў пазнаў у гэтым персанажы сябе і падаў пазоў — у абарону гонару і годнасці... Іосіфа Сталіна.

Але да таго судовага працэсу вярнуся крыху ніжэй.

Прывід Сталіна блукае па краінах СНД. У дзень, калі адкрывалі помнік у Запарожжы, у Данецку запэцкалі фарбай білборд з выявай Сталіна (на адной фатаграфіі з Рузвельтам і Чэрчылем). У Санкт-Пецярбургу хітрамудрыя камуністы выкупілі месца пад рэкламу на гарадскім аўтобусе і змясцілі на ім фотапартрэт правадыра. Нехта яго замазаў фарбай, але партрэт пачысцілі, і тралейбус з ветэранамі-актывістамі ў якасці пасажыраў зноў пачаў курсіраваць па Неўскім праспекце. У Магадане — адным з цэнтраў былога сталінскага ГУЛАГа — 9 мая таксама плануецца адкрыць помнік Сталіну.

У Маскве, праўда, ад размяшчэння білбордаў з партрэтамі генералісімуса на вуліцах адмовіліся. Ветэраны-сталіністы змогуць там маліцца на свайго ідала толькі ў зачыненых памяшканнях.

Нядаўна прэм'ер-міністр Расіі Пуцін заявіў, што сталінскім злачынствам не можа быць апраўдання. Прэзідэнт Мядзведзеў у сваім інтэрв'ю «Известиям» з нагоды Дня Перамогі падкрэсліў, што ў вайне перамог не Сталін, але народ.

Нядаўна на афіцыйным сайце дзяржаўнага Расійскага архіва былі апублікаваны фотадакументы па гісторыі злачынства ў Катыні — у тым ліку рашэнне аб расстрэле польскіх зняволеных, за подпісамі Сталіна, іншых членаў сталінскага палітбюро. Гэтыя дакументы былі вядомыя і раней, але выстаўляючы іх у сувязі з 70-й гадавінай катынскіх расстрэлаў, дзяржава тым самым, па сутнасці, прызнае факт злачынства.

Але нішто, ніякія дакументы і сведчанні не могуць пераканаць прыхільнікаў аднаго з галоўных людажэрцаў ХХ стагоддзя ў тым, што ён быў злачынцам. Для іх ён — пераможца Гітлера, бязгрэшны і вялікі.

А значыць, і ўсе яго памагатыя былі бязгрэшныя.

### Шкоднік Вавілаў і герой Хват

У 1988 годзе журналістка Яўгенія Альбац узяла інтэрв'ю ў следчага Аляксандра Хвата.

«Скажыце, вы верылі ў тое, што Вавілаў — шпіён?» — «У шпіянаж я, вядома, не верыў — звестак не было. Гзн. было заключэнне агентурнага аддзела — існаваў такі ў Галоўным эканамічным упраўленні НКВД <...>. Яны і пастанову на арышт па такіх справах пісалі. Ну, а што тычыцца шкодніцтва — штосьці ён <...> не так у сваёй сельскагаспадарчай навуцы рабіў. Тут я сабраў экспертызу — акадэмік не ўзначальваў, да Трафіма Лысенкі ездзіў. Яны, то бок акадэмікі і прафесары, пацвердзілі: так, шкодзіў».

І гэта — пра аднаго з самых выдатных генетыкаў, дасягненні якога ўжо тады прызнаваў увесь навуковы свет. Вавілаў быў арыштаваны ў жніўні 1939 года. Спачатку яго абвінавачвалі ў тым, што ён «вядзе барацьбу супраць тэорый Лысенкі, Цыцына і Мічурына». Потым дадаліся абвінавачанні ў «контррэвалюцыйнай дзейнасці» і шпіянажы. Дапытвалі акадэміка 11 месяцаў. Па сведчаннях самога Вавілава, агульная працягласць допытаў склала больш за 1700 гадзін.

9 ліпеня 1941 года яму прысудзілі расстрэл. У сувязі з набліжэннем нямецкіх войск да Масквы Вавілава этапавалі ў турму НКВД у Саратаў. Там ён і памёр ад голаду і хваробы сэрца 23 ліпеня 1942 года, падчас бітвы за Сталінград.

Абаронца Шахаўцова ў судзе казаў: «Нідзе не даказана, што следчы Хват катаваў Вавілава. Ніякі суд гэта не ўстанавіў. Значыць, ніхто не мае права называць яго катам». А значыць, і падабароннага Шахаўцова ніхто не можа называць «абаронцам ката».

У 1955 годзе вайсковы пракурор маёр юстыцыі Калеснікаў у сваёй справаздачы пісаў, што «матэрыялы справы супраць Вавілава былі сфальшаваныя». Следчы Хват у справаздачы характарызаваўся як вядомы «фальсіфікатар следчага матэрыялу». Гэтыя высновы прыводзіць у сваёй кнізе «Забойства Мікалая Вавілава» амерыканскі журналіст Пітэр Прынгл (Peter Pringle. The murder of Nikolai Vavilov. The story of Stalin's persecution of one of the twentieth century's greatest scientists).

Але Хват (не кажучы пра «шкодніка» Вавілава) для Шахаўцова не быў галоўным. На судовым працэсе ў Маскве ў верасні 1988 года (яго апісаў тады ў часопісе «Огонёк» журналіст Аляксандр Мінкін) ён казаў:

«У цяперашні момант адбываецца распальванне антысталінскай істэрыі і іншых негатыўных з'яваў нашага грамадства... Васіль Быкаў паклёпнічае на Іосіфа Вісарыёнавіча...

Пісьменнікі-паклёпнікі горш за Бі-бі-сі і «Голас Амерыкі» ганяць асобу Сталіна, прыпісваючы яму грахі, выдумляючы ачарняльныя матэрыялы пра чалавека, які 30 гадоў быў кіраўніком нашай нацыі... Я дыхаю паветрам 1930-х, жыву энтузіязмам 30-х, а мяне не друкуюць, як іншадумца... Я патрабую графалагічнай экспертызы рэзалюцый «біць! біць! біць!», што прыпісваюцца Іосіфу Вісарыёнавічу... У адзін шэраг са мной і абылганым Хватам пастаўлены Сталін і яго паплечнікі — члены Палітбюро, камуністы Молатаў, Кагановіч і іншыя... трэба абвергнуць усе дакументы, якімі спрабуюць зганьбаваць добрае імя геніяльнага правадыра».

### Апошняя ахвяра

Суд пазоў Шахаўцова адхіліў. Той судовы працэс быў адлюстраваны ў дакументальным фільме беларускіх кінематаграфістаў Аркадзя Рудэрмана і Юрыя Хашчавацкага «Сустрэчны пазоў». Акурат дваццаць гадоў таму гэты фільм атрымаў Гран-пры міжнароднага кінафестывалю ў Санкт-Пецярбургу. Тады словы Шахаўцова ўспрымаліся як самавыкрыванне, здавалася, што ўся сталінска-савецкая эпоха назаўсёды скончыцца, адыдзе ў нябыт разам з шахаўцовымі.

Савецкага Саюза сапраўды вельмі хутка не стала. Але працэсу над злачынствамі саветаў, падобнага да нюрнбергскага, так і не адбылося. Прэцэдэнт быў створаны толькі нядаўна. Летась Кіеўскі гарадскі суд прызнаў тых самых людзей, якіх згадваў некалі харкаўскі пракурор, а таксама Касіёра, Постышава і іншых бальшавіцкіх правадыроў вінаватымі ў арганізацыі Галадамора 1930-х гадоў. І хаця справа была спынена ў сувязі са смерцю абвінавачаных, фактычна суд наўпрост назваў іх злачынцамі. І адмяніць гэты прысуд ніхто не ў стане.

Хай новыя ўлады Украіны пасля перамогі Януковіча на прэзідэнцкіх выбарах скасоўваюць указы аб прысваенні Бандэру і Шухевічу звання Герояў, хай спрабуюць прынізіць значэнне нацыянальна-вызвольнай барацьбы ўкраінцаў за незалежнасць, хай гавораць на «общчапанятнай» мове — усё адно «рэгіяналам» і іх саюзнікам-камуністам не ўдасца вярнуць назад савецкую гісторыю, рэабілітаваць Сталіна і яго паплечнікаў.

Некалі ў дзяцінстве мяне і маіх аднагодкаў палохалі ў школе словам «рэваншысты». Разумелі пад гэтым словам міністра абароны ФРГ Штраўса, іншых нямецкіх палітыкаў, малявалі карыкатуры на іх у выглядзе пачвараў з бомбамі ў руках, па локаць у крыві. Сёння канцлерка Германіі едзе на святкаванне 9 Мая ў Маскву.

А сапраўднымі рэваншыстамі ёсць Шахаўцоў і яму падобныя. Яны прагнуць рэваншу — за за праўду аб ГУЛАГу і вайне, за распад савецкай імперыі, прагнуць вяртання правадыра.

І як заўсёды раней, гатовы ісці да «светлай мэты», пераступаючы праз трупы — хоць бы той пенсіянеркі, што памерла пры адкрыцці помніка правадыру.

Дай Бог, каб гэта была апошняя ахвяра.

# Ці належыць беларусам чапляць георгіеўскія стужкі?

У апошнія гады ў Беларусі, услед за Расіяй, з'явілася традыцыя перад 9 Мая ўпрыгожваць аўтамабілі і дамы чорна-аранжавымі стужкамі — так званымі георгіеўскімі.

Іх рэкламуюць на білбордах, развешваюць на вітрынах крамаў, раздаюць на вуліцах. Што гэта за стужка і якое дачыненне да Беларусі яна мае?

Чорна-аранжавая стужка ўпершыню з'явілася як дадатак да самай высокай узнагароды Расійскай Імперыі — Ордэна святога Георгія. Яе колеры азначалі дым і агонь і сведчылі аб мужнасці жаўнера на месцы бою. Пасля распаду імперыі ўсе яе ўзнагароды выйшлі з ужытку і ў СССР георгіеўская стужка вярнулася толькі ў часы вайны пад назвай «гвардзейскай». Ёй упрыгожвалі Ордэн Славы, а пасля вайны і медаль «За перамогу над Германіяй».

Ордэнам Славы ўзнагароджваліся толькі шарагоўцы і сяржанты, а таму для савецкага грамадства ён



стаў сімвалам мужнасці простага жаўнера.

Наколькі апраўданае выкарыстанне чорна-аранжавай стужкі ў Беларусі? Калі ўлічыць, што гэта адзін з сімвалаў Расійскай Імперыі, то такое пакланенне перад ёй выглядае дзіўнавата. А калі пагадзіцца, што георгіеўская стужка — сімвал мужнасці простага жаўнера, то навошта тады ўпрыгожваць ёй пляшкі з гарэлкай ды начныя клубы? Удзельніка вайны, які звязвае з гэтым сімвалам памяць аб тых страшных днях, гэта можа адно абразіць.

Калі мы хочам ушанаваць мужнасць беларусаў і грамадзянаў Беларусі іншых нацыянальнасцяў, якія склалі галовы за свабоду ў той вайне, больш адпаведна рабіць гэта з выкарыстаннем нацыянальных колераў — бел-чырвона-белых ці чырвона-зялёных, хто якія вызнае. Але не колераў імперыі, якая была акупантам Беларусі, адабрала ў беларусаў іх вольнасці, зруйнавала нашы ратушы і нашу культуру і давяла нашу краіну да стану адной з найбяднейшых у Еўропе.

Памяць пра вайну трэба аддзяліць ад імперскай прапаганды.

**МБ**

### Каменты на nn.by

* * *

Цяпер толькі лянівы не рэкламуецца георгіеўскай стужкай. Ролік: фанфары, ветэраны... «Купляй суперлато, і мы зноў пераможам!..» Сёння чапляюць стужачку, заўтра — чужыя ордэны.

**Георгіеўская стужка ў руках дзялкоў**

* * *

Прыгадваецца дэм: гвардыі старшы сяржант Фролаў заплаціў за гэтую стужку крывёю, а ты?!

**ВП**

* * *

Стужачкі хоць і ўвяла калісьці імперская ўлада, цяпер гэтага ўжо ніхто не памятае. Гэта проста след СССР. Але не такі, як партрэт Сталіна. Таму няхай самі ветэраны рашаюць, што з гэтымі стужкамі рабіць. І не трэба гэтага азначэння «імперская сімволіка».

**Мыжыыык**

* * *

Гэта была чужая вайна двух тыранаў і, адпаведна, чужая перамога. Беларусы былі гарматным мясам, наша зямля — разменнай манетай. У выніку мы згубілі мільёны людзей і этнічныя тэрыторыі. Дык якая гэта перамога?

**Vit**

* * *

Хто чапляе георгіеўскую стужку і ўжывае назоў ВАВ, аўтаматычна прымае сталінскую мараль Другой сусветнай.

**Варган**

# Канстанцін Гайдук: «Увесь

Яго бацька быў рэпрэсаваны НКВД, вёску спалілі нацысты, дзядзькоў расстралялі савецкія партызаны.

**Канстанцін Іванавіч Гайдук зведаў і боль сталінскіх рэпрэсіяў, і жахі вайны, і пасляваенную разруху. Ён нарадзіўся 79 год таму ў вёсцы Саўскі Бор, каля Бягомля. Спадар Гайдук абышоў усе ваколіцы, збіраючы сведчанні людзей, якія, як і ён, пацярпелі ў вайну і ад немцаў, і ад партызанаў.**



**Канстанцін Гайдук.**

## 1930-я: арышт за арыштам

«Я пачаў займацца гэтым пытаннем, таму што ўвесь род наш зніштожылі», — з горыччу кажа Канстанцін Іванавіч. Яго продкі — прыгонныя сяляне. Бацька, Іван Аляксеевіч Глазко, пайшоў у Чырвоную Армію добраахвотнікам. Пад Бягомлем трапіў у палон да палякаў, але здолеў збегчы.

У 1929 г. НКВД арыштавала дзядзькоў спадара Канстанціна, старэйшых братоў яго бацькі — Міхаіла і Аляксандра Глазко. Трыбунал у Віцебску асудзіў іх да дзесяці год лагераў як шпіёнаў. «Былі яны моцныя, здаровыя, працаваць умелі. Дзядзька Міхалка з зямлёй размаўляў, як з чалавекам. Ідзе па полі, возьме зямлю ў руку, прыкладзе да вуснаў: «Вой, зямліца мая, вой, ужо ж я хутка цябе буду араць ды засейваць!» — узгадвае спадар Гайдук.

У 1933 г. — новы ўдар: арыштавалі бацьку спадара Канстанціна разам з пляменнікам Арціпам, сынам «шпіёна» Міхалкі. Дадому бацька ўжо не вярнуўся. Пазней Канстанціну Іванавічу паказалі ў КГБ загад на яго расстрэл. Рэпрэсіўная машына праглынула амаль усю мужчынскую частку сям'і.

## Нечаканае вызваленне

«Жылі мы — не дай Бог, — узгадвае Канстанцін Гайдук. — У нас усёўсё забралі. Кубак, вядро, зерне да кропелькі. І нават забаранілі маме хадзіць у лес па дровы». А ў яе было трое малых дзяцей на руках. Знаёмы міліцыянер параіў жанчыне развесціся з мужам, ворагам народа. Інакш, маўляў, самі патрапіце ў Сібір. Так Канстанцін Іванавіч атрымаў прозвішча маці — Гайдук. Але — дзіва дзіўнае: у 1933 г. дзядзькі Міхалка і Аляксандр вярнуліся з лагераў у Карэліі, бо ім скарацілі тэрмін. Дзядзьку Міхалку дазволілі пасяліцца ў Лепелі. Уначы ён употайкі прыходзіў у Саўскі Бор. Калі пачнецца вайна, Міхалка здолее вярнуцца ў родную хату. На сваю бяду...

## Налёт карнікаў

Наступ немцаў быў імклівым. На акупаванай Бягомльшчыне паклысе арганізоўваліся партызанскія атрады.

«Адна з групаў, пад кіраўніцтвам Сцяпана Манковіча і Рамана Дзякава, захапіла нямецкую машыну на шашы, расстраляла шафёра. І прыгнала яе ў нашую вёску! — распавядае Канстанцін Гайдук. — Нашто? Немцы ж расстрэльвалі сялянаў за малейшае падазрэнне ў сувязях з партызанамі! А атрад Міхаіла Бычкова прыйшоў ў Бягомль і абрабаваў краму. Ішлі адтуль, курылі, кідалі паперкі — і зноў-такі ў нашую вёску. Ну, немцы паслалі карнікаў. Добра, што гэта былі літоўцы, яны толькі хаты знішчылі. Калі б немцы — яны б нас там, як мышэй, папалілі».

## Народныя мсціўцы

19 снежня партызаны занялі Бягомль і пачалі складаць спісы вяскоўцаў, падазраваных у сувязях з немцамі. Патрапіў у спісы і «былы шпіён» дзядзька Міхалка. Далей разыгралася драма, пра якую Канстанціну Гайдуку расказваў яе непасрэдны ўдзельнік, партызан Пётр Шаман: «На другі дзень Каляд, 8 студзеня, партызаны пад'ехалі да хаты, дзе жыў дзядзька Міхалка: «Хадзі-ка сюда, садзіся». Завезлі пад вёску Бераснёўку, у ельнічак: «Злазь!» Дзядзька Міхалка перахрысціўся, стаў. Ведаў ужо, што апошняя дарога. Раптам — ляціць вазок. Пад'язджае чалавек з Домжарыц, Вашкевіч Іван, сябра Манковіча. Гэты Іван дужа ненавідзеў дзядзьку Міхалку. Як нашых арыштавалі, ён, Вашкевіч, забраў сабе хату Уладзіміра, малодшага брата дзядзькі Міхалкі.

> Прыйшоў дадому — а ні сёстраў, ні жонкі, ні бацькі няма. Жанчынаў партызаны застрэлілі, а бацьку — немцы.

І вось дзядзька Міхалка патупаў па снезе, шапка такая старэнькая, валёнкі старэнькія — ну дзе ж яму, ведаеце, было пасля лагера новае справіць... А Іван Вашкевіч узяў у аднаго з партызанаў вінтоўку і сам яму ў спіну стрэліў. Такая была нянавісць!»

## Працяг расправы

Пра тое, што адбылося далей, спадару Гайдуку распавяла яго пляменніца, Надзея Глазко: «Сын дзядзькі Міхалкі, Віктор, паехаў у Бераснёўку на Каляды ў госці. Партызаны — за ім. І павезлі ў тое самае месца, каб расстраляць».

Каля ўзлеску іх дагнала сястра Віктора, Ксенія, якая ехала следам. А з суседняй вёскі ўжо ляцела поўная жаху Надзея Глазко. Па дарозе ехалі і іншыя людзі з Бераснёўкі — за сенам. Паднялі крык: «А што вы робіце! Немцы забівалі, а цяпер вы забіваеце!» — узгадвае спадар Канстанцін аповед Надзеі. — Тады партызаны пасадзілі Віктора ў сані і прывезлі ў штаб да Манковіча. Ён на іх: «Чаму не расстралялі?» А Віктор з Манковічам — землякі, разам служылі ў арміі ў 1922 г., ложкі побач стаялі. Цераз дзверы было чутно, як Манковіч казаў Віктору: «Я памыляўся ў табе. Чаго ты жывеш са шпіёнам?» «Гэта ж мой бацька, які ён шпіён?» — спытаўся Віктор. Грымнуў стрэл. А жонцы Віктора Насце ўжо сказалі, што Віктора забралі. Тая так ляцела, здаецца, ніякая б сіла не спыніла. Уламілася туды, упала на мужа: «Ай, мой родненькі!» А Манковіч падышоў — і ёй у галаву стрэліў. Потым сказаў: «Вязіце ў Беразіно (гэта радзіма Манковіча, дваццаць кіламетраў ад Бягомля) і павесьце там на дрэве».

Вёз трупы ў Беразіно той самы партызан Пётр Шаман, з якім спадар Гайдук гутарыў пасля вайны: «Прывезлі. Сабраліся людзі: «Каго ж будуць казніць, што такое?» Іх целы выкінулі з вазка, адзін партызан, прахадзімец такі, пачаў вяроўку вешаць на бярозе. А людзі як закрычалі! Яны пабачылі, што гэта Віктор. Знаёмыя, нават родныя былі. Дык партызаны трупы зноў у вазок за рукі-ногі ўкінулі і кудысьці завезлі».

## Знішчэнне «падазроных»

«Я вельмі шмат пахадзіў па гэтым раёне, у кожнай хаце быў, — запэўнівае Канстанцін Гайдук, гартаючы свае запісы. — Вось, напрыклад, Іван Ставер. Польскую вайну прайшоў, фінскую прайшоў і на другі дзень добраахвотнікам у гэтую вайну пайшоў. Абараняў Маскву, Ленінград, быў двойчы параненні. Прыйшоў дадому — а ні сёстраў, ні жонкі, ні бацькі няма. Жанчынаў партызаны застрэлілі, а бацьку — немцы. Яго сёстраў, Кацю і Алу, і жонку Марыю партызаны абвінавацілі ў супрацоўніцтве з немцамі і расстралялі ў лесе пад Бераснёўкай. Чаму, маўляў, не забаранялі немцам да вас у хаты заходзіць? А куды людзям было падзецца? Увогуле, у тыя дні партызанскія спецгрупы знішчылі ў нашых ваколіцах больш за 60 чалавек».

## Расплата за спаленую вёску

Гісторыя са спаленай вёскай Саўскі Бор мела крывавы працяг. Партызаны абвінавацілі сям'ю Рашэўскіх, якая жыла на хутары Перасоў, у тым, што яны навялі карнікаў. «Усю сям'ю выбілі, — абураецца Канстанцін Гайдук. — Партызаны самі след праклалі ў вёску скрадзенай нямецкай машынай. Але трэба было на некім адыграцца».

> Хлопчык, які ў калысачцы быў, закрычаў. Дык партызаны яму прыкладам разбілі ўсю галоўку.

Канстанцін Гайдук добра ведаў Рашэўскіх: «На тым хутары адзінаццаць чалавек жылі, у асноўным — жанчыны і дзеці. Добрыя былі людзі, бедныя. Бацька да вайны леснікам быў». Пра тое, што адбылося на хутары, Канстанціну Гайдуку распавёў сын гаспадара хутара Канстанцін Рашэўскі, які тады быў яшчэ хлопчыкам і цудам выжыў. Спадар Гайдук адшукаў яго пасля вайны ў Барысаве: «Ён мне расказваў, што тата і мама плакалі, прасілі: вы нас пастраляйце, дзяцей толькі не кранайце. А партызаны іх і пачалі страляць. Хлопчык, які ў ка-

# Партызанка на Бягомльшчыне: афіцыйны погляд




Афіцыйны погляд на падзеі выкладзены ў кнізе: **І. Ф. Ціткоў «Брыгада «Жалязняк»**, Мінск, «Беларусь», 1976 г.

«Сцяпан Сцяпанавіч Манковіч не любіць шмат расказваць пра свае падпольныя і баявыя справы», — такімі словамі пачынаецца кніга «Брыгада «Жалязняк».

Сакратар Бягомльскага райкама партыі С.Манковіч лічыцца стваральнікам мясцовай партызанкі. Першы атрад ён стварыў у красавіку 1942 г. на базе групы падпольшчыкаў і афіцэраў-акружэнцаў.

Што да адмоўных успамінаў вяскоўцаў пра партызанаў, то ў афіцыйных публікацыях пашырана такое тлумачэнне: «Паліцаі, якія рабавалі сялянаў, часцяком прыкідваліся партызанамі, каб настроіць іх супраць сапраўдных народных мсціўцаў».

Варта адзначыць, што брыгада «Жалязняк» складалася ў асноўным з мясцовых людзей. Паводле афіцыйных звестак, партызанілі 23% жыхароў Бягомльскага раёна. Пры гэтым вайскоўцы, якія выйшлі з акружэння ці збеглі з палону і далучыліся да мясцовай партызанкі, складалі не больш за 8% брыгады.



**Брыгада «Жалязняк» на маршы.**

Кіраўнікі брыгады «Жалязняк» Манковіч і Ціткоў атрымалі званне герояў Савецкага Саюза.



**Сцяпан Манковіч.**

# род наш зніштожылі»

лысачцы быў, закрычаў. Дык яны яму прыкладам разбілі ўсю галоўку. Яму тры годзікі было. А другі хлопчык, Косця, які ляжаў на ложку (яму пяць год было), галаву прыўзняў, і нехта стрэліў яму ў грудзі. Куля дайшла да хрыбетніка і засела. І ён згубіў прытомнасць. Колькі ён там ляжаў — не памятае. Праз нейкі час людзі з вёскі Вускрам'е ішлі туды, за раку, у ягады. Падышлі да хутара, а там сабакі брэшуць, выюць! Каровы равуць дзіка! Яны зайшлі ў хату, а там — трупы. Тады яны хуценька паведамілі ў Пастрэжжа, дзе гэтых хутаранаў, католікаў, радня. Прыехалі яны на хутар і заўважылі, што гэты хлопчык жывы, кроў цячэ... Адвезлі яго ў Падстрэжжа. Там дактары партызанскія яму рабілі аперацыю, дасталі кулю».

Размаўляў спадар Гайдук і з Іванам Аўтушкам, родным братам партызанскага камандзіра Кузьмы Аўтушкі. Канстанцін Іванавіч кажа, што Іван распавядаў яму, як «стаяў пад акном хаты», пакуль там чынілася партызанская помста.

### Нямецкія прыслужнікі

Нацярпеліся жыхары Саўскага Бору і ад беларусаў, якія прыслугоўвалі немцам. У 1943 г. вёску зноў спалілі. Сям'я Гайдукоў перазімавала ў вёсцы Пераходцы, а ўвесну вярнулася на сваё пажарышча. «Пасяляліся неяк, загатавалі матэрыял, дошак — і пачалася блакада, — узгадвае спадар Канстанцін. — Як гэта страшна было! Немцы ідуць — усё жывое паляць, забіваюць... Мы пазакопвалі тое-сёе і паехалі ў балота, у лес, схаваліся ў шалашы. Раніцай я залез на высокую елку і паглядзеў у бок Бягомля. Вёскі гараць, як свечкі! Дымы, здавалася, аж пад неба падымаюцца».

Неўзабаве сям'я Гайдукоў наважылася вярнуцца ў Саўскі Бор. Ажно выявілася, што вёску зноў знішчылі. Прычым, найбольш шкоды нарабілі падводчыкі — тыя, каго немцы набіралі з мясцовага насельніцтва для арганізацыі перавозак. «Падводчыкі — мярзотнікі, нягоднікі, параскрывалі нашыя ямы-схованкі, патапталі гароды, усё, што мы нарыхтоўвалі, у дварах папалена, — абурана ўзгадвае Канстанцін Гайдук. — У каго хата была няскладзеная — таксама спалілі. Я потым іх адшукаў. Гэта людзі былі з Лепельскага раёна. Я, праўда, не заяўляў на іх у КДБ. Можна было, але перадумаў...»

### Лясны шпіталь

Партызаны пастанавілі стварыць лясны шпіталь за 3 км ад Саўскага Бору. Канстанцін Гайдук разам з іншымі вяскоўцамі да лістапада 1943 г. пабудавалі там сем зямлянак. Дапамагаў падвозіць раненых.

> Трэба было немцаў перамагчы. Бо ў нас бы інакш і кропелькі свабоды не было.

Спадар Канстанцін з жахам узгадвае нямецкую бамбардзіроўку ў маі 1944 г.: «Мы крышку адбегліся з сястрычкай маленькай, пад паветку схаваліся, чуем: гудзяць самалёты. Стогн такі цяжкі. Налічыў васямнаццаць самалётаў. Як пачала калаціцца зямля, як пачало ўсё трашчаць, ірвацца, ламацца! Я далёка адбегся, а ўсё здаецца — над галавой ляцяць. У вёсцы — поўна дыму! На вуліцы, на гародах — ямы вялізныя, сцены павыламаныя, дахі з буйнакаліберных кулямётаў пасечаныя... Ай, як цяжка было! Як нас немцы ганялі! Мы пераначавалі на адным астравочку пасярод балота, а пасля пабеглі далей. Куды ні пабяжы — страляюць. Паўтоптваліся неяк у гэтае балота, паўціскаліся і травой зверху прыкрыліся. Адзін дзень, потым другі дзень так сама і трэці дзень... Памятаю, сядзеў я пад карчом — і раптам дождж пайшоў. Якая радасць, калі дождж ідзе! Я любіў дождж — бо немцы тады не хадзілі па лесе. Я сеў на карчы, ногі выцягнуў — а сам басанож, увесь мокры. І раптам бачу: даўжэзная гадзюка скруцілася каля ног маіх! Чорная такая, у лусачкі. Галаву крыху прыўзняла — і папаўзла прэч. А я ёй пазайздросціў. Думаю: якое ёй шчасце, як ёй добра жыць! Нікога не баіцца...»

### Свае!

Праз тыдзень вярнуліся ў спаленую вёску. «Спалі, не распрануўшыся», — распавядае спадар Канстанцін. І раптам: «У небе ляцяць самалёты. Зорачкі на крылах! А па дарозе чалавек скача, ногі ледзь не да зямлі: кабылка маленькая. Пад'язджае да нас і крычыць: «Нашы прыйшлі, нашы прыйшлі!» Мы пабеглі, глядзім: так, салдацікі нашы! Ой, мы як рынуліся да іх... Пачалі абдымаць, цалаваць! Сталі распавядаць, як нам цяжка было, як мы доўга пакутавалі, мучыліся», — узгадвае спадар Канстанцін са слязьмі на вачах.

Танкі з савецкімі салдатамі дайшлі да вёскі Броды. Але радасць была заўчаснай: «А потым сцярвятнікі наляцелі нямецкія... І знішчальнікі, і бамбавозы. Як пачалі яны бамбіць лес, дзе танкі стаялі... Як грымела ўсё! І зеніткі білі. У небе ірвецца снарад — і адразу аблачынка ўзнікае. Здавалася, што тымі баранчыкамі ўсё неба пакрылася. А потым мы даведаліся, што былі пабітыя нашы танкісты. Ой, як мы гаравалі, як сумавалі... Яны ж ішлі нас ратаваць, недзе і родныя іхнія, і жонкі, і сем'і, і дзеці. Такі сум нас браў, што яны прыйшлі і тут ужо палеглі навечна...»

### Розныя былі партызаны

Жыццё пасля вайны было цяжкае. Мужчыны загінулі — хто ў сталінскіх лагерах, хто на вайне. Гаспадарку цягнулі жанчыны і падлеткі. Неўзабаве калгас, у якім працаваў малады Косця Гайдук, расфармавалі, і ён падаўся на Мінскі трактарны завод. Папрацаваў пяць год і паступіў у педінстытут на завочнае аддзяленне. 35 год адрабіў школьным настаўнікам. Толькі пад самую пенсію вярнуўся ў родны край. Яшчэ і дзецям, і ўнукам дапамагае грашыма з пенсіі ў часы крызісу: «Але і тое гэта радасць, што ёсць каму памагчы! Здаецца, недарма жыву...»

Ілюзіяў пра нацыстаў спадар Гайдук не мае: «Ідэя іх была галоўная — зрабіць нас рабамі. Трэба было немцаў перамагчы. Бо ў нас бы інакш і кропелькі свабоды не было. І так яе не бачылі, а калі б немцы прыйшлі — то нам было б вельмі цяжка».

Спадар Канстанцін не мае нянавісці да партызанаў, але прагне гістарычнай справядлівасці: «Я бачыў партызанаў, я бачыў, што там многія пакутуюць, але бачыў і тое, што там многія былі прахадзімцы. Скуралупы. Не кажу, што ўсе партызаны былі дрэнныя. Я ж вазіў у шпіталь раненых, хворых. Былі сапраўды добрыя, шараговыя. Бачыў партызана ў самаробных лапцях з гумы. У яго сумлення не хапала ў некага зняць боты. Былі сапраўдныя партызаны. Але былі і нягоднікі, у тым ліку і сярод тых, каго цяпер лічаць героямі».

І ўсё роўна, калі Канстанцін Гайдук узгадвае, як падлеткам працаваў у партызанскім шпіталі, то ў яго вачах запальваюцца зухаватыя агеньчыкі: «Калі б, не дай Бог, і сёння... То зноў бы ў партызаны пайшоў, чэснае слова!»

**Запісаў Алесь Кудрыцкі, фота аўтара**



**Бягомль — партызанская сталіца.**

**Аўдыёзапіс успамінаў Канстанціна Гайдука слухайце на сайце www.NN.by**

# «Усё забралі камуністы і савецкая ўлада»

**Настаўніца беларускай мовы з Мінска Аляксандра Сенчанка, зямлячка спадара Гайдука, мае падобны лёс. Яе бацька быў рэпрэсаваны ў 1930-ыя, а маці як жонка «ворага народа» падпала пад падазрэнне і была расстраляная ў вайну «народнымі мсціўцамі» разам са сваёй роднай сястрой. Падаем ліст спадарыні Аляксандры з невялікімі скарачэннямі:**

«...Хачу, каб хоць хтосьці пачуў крык душы. Таму і пішу адкрыта, бо ўжо даўно перастала баяцца, выпрасталася, падняла галаву. Хоць самі ўжо састарыліся, а боль не сціхае...

У 60-х гадах нам прыслалі рэабілітацыю на бацьку. Але бальшавікі і тут без маны не маглі: пісалі, што бацька памёр ад запалення варотнай вены ў 1942 годзе. Прыдумалі ж хваробу!

Прайшлі гады. Мой старэйшы сын быў у Віцебску і папрасіў у КДБ дакументы на бацьку майго. Яму паказалі. Там было толькі два лісты: адзін пратакол, у якім ён адмаўляў прыпісаную яму контррэвалюцыйную дзейнасць, а ў другім — поўнасцю пацвярджаў. Так яго там катавалі! У канцы другога допыту было напісана: расстраляць. І прыгавор быў выкананы 19 снежня 1937 года. А ўзялі яго ў жніўні. Мама казала: «Як аўсы жалі...»

Засталося нас у мамы чацвёра, і яшчэ дзяўчынка нарадзілася пасля бацькі, пятая. З калгаса выкінулі, соткі абрэзалі. Адзін толькі Бог ведае, як мы выжылі.

У нашым пасёлку быў завод, дзе палілі вугаль, гналі шкіпінар. Мне тады было чатыры гады, а ўжо хадзіла вугаль сеяць, каб не памерці з голаду, да сіта не даставала, цягнулася ручкамі... Як нас маці зберагла — не ведаю. Толькі памятаю: голад, голад, голад...

Пачалася вайна. За што абвінавацілі маці і сястру, не ведаем. Можа, маці не ўтрымалася, можа, сказала дзе што. Арыштавалі маці і сястру Ніну дзесьці ў студзені 1943 года, патрымалі некалькі дзён у Бягомлі ў партызанскай камендатуры, а потым расстралялі ў лесе пад Бераснёўкай. Там было многа расстраляных.

Не давалі і пахаваць. Брат (яму было тады 15 гадоў) некалькі разоў ездзіў, каб скрасці целы забітых маці і сястры і пахаваць. Удалося яму гэта дзесьці ў сакавіку, бо, памятаю, ужо было сонечна і раставаў снег.

Ляжалі маці і сястра на возе зусім змёрзлыя. Сястры ўсю галаву пасеклі кулямі. Каб у дамавіну палажыць, вытапілі лазню, адагрэлі. Ой! А мы, малыя, поўзаем каля дзвюх трун. Не давядзі Божа!

Пахавалі маці і сястру ў Замасточчы. А выжылі мы, малыя дзеці, толькі дзякуючы нашай вялікай дружбе — і брату. Брат узяў на сябе ўвесь клопат аб нас. Дарэчы, у так званых партызанаў, казалі, была думка забіць і брата, каб не было каму адпомсціць. Але чамусьці пакінулі. І ён стаў для нас і бацькам, і маці, і братам. Яшчэ была цётка гарбатая, бацькава сястра. Так і жылі. Самі сябе кармілі: сеялі, жалі...

У 1944 годзе брата, семнаццацігадовага хлапчука, узялі ў армію, не паглядзелі, што на руках у яго малалетнія дзеці. Усім сіротам дзяржава як-кольвек дапамагала, а нам — не: мы ж ворагі народа! Памятаю, як у 1945 годзе чырвонаармейцы прывезлі ў Бягомль дапамогу сіротам, нейкую тканіну. Усе сіроты пайшлі, усім давалі: каму на кашулю, каму на сукенку. Суседка кажа нам: «Ідзіце, вы ж таксама сіроты». Пайшлі з сястрой, доўга стаялі ў чарзе. Чырвонаармеец адарваў нам паркалю на сукенкі, а намеснік старшыні райвыканкама, які, дарэчы, добра ведаў нас, бо быў жанаты на стрыечнай бацькавай сястры, сказаў: «Ім не трэба даваць, іх бацька быў рэпрэсаваны ў 37-м годзе». Чырвонаармеец адклаў тканіну, паглядзеў на нас жаласліва, бо не мог, мусіць, выступіць супраць улады. Гэта вельмі мне ўрэзалася ў памяць. Так мы з Бягомля і прыйшлі ні з чым.

З усёй сям'і вышэйшую адукацыю атрымала толькі я, меншая. Бо ўсе ўжо працавалі і дапамагалі мне як маглі. Маю нават дзве вышэйшыя адукацыі, працую настаўніцай беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі. Але забыць пра мінулае не магу. Усё забралі, спаганілі камуністы і савецкая ўлада: дзяцінства, юнацтва, маладосць.

Адзінае, што захавалі мы на ўсё жыццё, — гэта пачуццё чалавечай годнасці, нацыянальнай. Мусіць, гены моцныя, парода харошая...»

**Аляксандра Сенчанка (Шыла), Мінск**

# Чым была для Беларусі тая перамога?

**У самай крывавай вайне XX стагоддзя Беларусь згубіла 1,6 млн жыхароў. Тэрытарыяльныя набыткі азмрочыла страта Вільні і Беластока. Аднак самае галоўнае — беларусы захаваліся як нацыя. У выпадку перамогі нацыстаў нас фізічна вынішчылі б. Піша Андрэй Дынько.**

Для многіх нацый Заходняй Еўропы Другая сусветная стала як бы паўторам Першай. Для беларусаў Другая сусветная вайна была канцом свету.

Краіна змяніла межы. Нацыянальная эліта была вынішчана амаль да апошняга чалавека, а ацалелыя расцерушыліся па свеце. Матэрыяльны фонд быў амаль зруйнаваны: праз Беларусь двойчы перакаціўся фронт, абодва праціўнікі вялі татальную вайну і пакідалі па сабе выпаленую зямлю.

І непапраўнае — з 9,2 мільёна жыхароў на 1941 год да 1945-га загінулі каля 1,6 млн. Сувымерныя страты жыхарства, акрамя Беларусі, зазнала толькі Польшча. Такіх зверстваў нацыстаў, у тым ліку ў Беларусі, свет не бачыў.

Каля 600 тысяч палонных вайскоўцаў замарылі голадам на вачах у застрашанага насельніцтва. Дзясяткі вёсак былі спаленыя з людзьмі жыўцом. Каля 600 000 габрэяў былі замардаваныя ад малога да старога толькі за сваю нацыянальнасць. Сотні тысяч беларусаў загінулі ў савецкім войску, якое не лічылася з чалавечымі ахвярамі.

Сярод гэтага азвярэння мільёны беларусаў праявілі свае найлепшыя якасці. Тысячы людзей дапамагалі хавацца палонным, уцекачам, камуністам і габрэям, на якіх палявалі немцы. Тысячы іншых самаарганізоўваліся для выжывання і захоўвалі нацыянальную і рэлігійную традыцыі. Беларусы, сярод якіх будучы народны пісьменнік Васіль Быкаў, мужна ваявалі ў складзе савецкай арміі. Дзясяткі тысяч беларусаў пад акупацыяй далучыліся да руху супраціву. У вялікіх беларускіх лясах утварыліся актыўныя партызанскія злучэнні.

Саветы інспіравалі вылазкі, каб правакаваць немцаў на акцыі помсты, з мэтай распальваць антынямецкія настроі. Нацысты ж пад прэтэкстам барацьбы з партызанамі разгортвалі палітыку вынішчэння спачатку жыдоўскага, цыганскага, а пасля і славянскага насельніцтва. Яны нацкоўвалі беларусаў на палякаў, літоўцаў — на беларусаў і г.д., каб вынішчаць адных рукамі другіх.

У 1941 годзе многія сустракалі немцаў — якіх памяталі па Першай сусветнай — як вызваленне ад зненавідных саветаў. Саветаў, якія за 1930-я вынішчылі каля 200 000 жыхароў Беларусі, і яшчэ каля 400 000 былі дэпартаваны ці адпраўлены ў канцлагеры. Ахвяры камуністаў і іх сваякі нярэдка ішлі на супрацу з акупантамі. Аднак расісцкі характар новай улады хутка стаў яўны, хоць пра план «Ост» мясцоваму насельніцтву і не было вядома. Працвеpassword лідэры

На жаль, на 1941 год наймацнейшыя нацыянальныя лідэры былі ці замардаваны саветамі — Чарвякоў, Тарашкевіч, — ці сядзелі ў савецкіх турмах — як Антон Луцкевіч. Папулярных асобаў, здольных згуртаваць нацыю для змагання за незалежнасць, абапершыся на дапамогу заходніх дэмакратый, у краіне не заставалася. Таму нацыянальна-вызвольны рух у Беларусі ў часе Другой сусветнай і пасля яе быў слабейшы, чым у суседніх Літве і Украіне.

Другая сусветная для Беларусі пачалася 1 верасня 1939 года. У выніку вайны да Усходняй Беларусі была далучаная Заходняя, і большасць этнічна беларускіх тэрыторый апынулася ў адной адміністрацыйнай адзінцы пад савецкай акупацыяй. Рацыянальнае адабрэнне ўз'яднання азмрочвалася горыччу страты Вільні і Беластока — выдатных культурных і эканамічных цэнтраў. Іх Масква спачатку далучыла да Беларусі, але неўзабаве аддала ў якасці падарункаў таксама акупаваным Літве і Польшчы.

Саветы спрытна міфалагізавалі Другую сусветную вайну для панавання над паняволенымі народамі Цэнтральнай Еўропы. Так, у выпадку Беларусі саветы маніпулявалі гістарычнымі наратывамі, лічбамі і фактамі. Лічбу ахвяраў, і без таго вусцішную, павялічвалі за кошт стварэння двайной бухгалтэрыі стратаў, двайнога ўліку загубленых савецкіх ваеннапалонных.

Аднак гэтыя спекуляцыі не павінны засланяць галоўнага. Другая сусветная вайна была вайной супраць абсалютнага зла. Дзякуючы перамозе над гітлераўцамі, беларусы захаваліся як нацыя. У выпадку перамогі нацыстаў нас фізічна вынішчылі б. Бо «жыццёвую прастору» на ўсход ад Нямеччыны нямецкія расісты прызначалі для сваёй каланізацыі.

Пасля 9 мая 1945 года ў розных раёнах Беларусі, асабліва заходняй, працягвалася партызанская вайна супраць саветаў, якая набыла характар грамадзянскай і забрала жыцці тысяч людзей. Салдаты-беларусы працягвалі гінуць на японскім фронце. Тым не менш, найстрашнейшае заставалася ўжо ззаду.

Беларусь была сярод пераможцаў, заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Жахі і навука з той вайны знайшлі сваё адлюстраванне ў велічных творах Быкава, Брыля, Адамовіча, Савіцкага, Пташука.

Непрыманне вайны як сродку вырашэння канфліктаў, непрыманне расізму з нацызмам сталі фундаментальнымі ў светапоглядзе беларусаў.

# Цаліна, партызаны і Коля ў пагонах

**9 мая ў Беларусі адзначалася 65-годдзе Перамогі. З гэтай нагоды ў Мінску прайшоў урачысты парад вайсковай тэхнікі. Акрамя жаўнераў, у ім паўдзельнічалі таксама «савецкія партызаны» і нават «заваёўнікі цаліны».**






У парадзе было задзейнічана больш за 130 адзінак баявой тэхнікі, а таксама 40 самалётаў і верталётаў. У параўнанні з сёлетнімі ўрачыстасцямі на Чырвонай плошчы, дэманстрацыя сілы беларускай арміяй выглядала сціпла. Падчас падрыхтоўкі да парада ў раёне сталічнай плошчы Бангалор загарэлася вайсковая тэхніка.

Павесяліў парад і сваёй тэатралізаванай моладзева-спартыўнай часткай. Асаблівую ўвагу гледачоў прыцягвалі «партызаны» ды «цаліннікі». Першыя вызначаліся надзіва маляўнічымі касцюмамі, а апошнія метровымі макетамі каласкоў. Завяршалася шэсце моладзі і ўвесь парад праносам вялізнага 75-метровага чырвона-зялёнага сцяга.

Парад 9 Мая больш нагадваў тэатр абсурду, чым нейкае сур'ёзнае і ўрачыстае мерапрыемства. Алею ў агонь падліў нават Лукашэнка, прывёўшы туды свайго малодшага сына Мікалая ў вайсковай форме. Іншых эмоцый, апроч смеху, ад парада, на якім камандуе 6-гадовае дзіця, гарыць тэхніка, ледзьве не падаюць самалёты і дэфілююць бээрэсэмаўцы з кардоннымі каласамі, быць проста не можа.

**Алесь Пілецкі,**
**фота Юліі Дарашкевіч**



# Як катавалі ў Сярэднявеччы



Гэта ў нашы гуманныя часы заклік «Гавары праўду!» не выклікае марозу па скуры. Гадоў чатырыста таму ён мог спалучацца з ужываннем вось такога спецабсталявання. У Мінск прыехала выстава старажытных прыладаў катавання, беражліва захаваных у расійскім Дзяржаўным музеі гісторыі Санкт-Пецярбурга «Петрапаўлаўская крэпасць».

Чалавечай крыві на нялюдскіх прыстасаваннях няма: гэта дакладныя копіі. Але дзяцей і проста ўражлівых асобаў на выставу лепей з сабой не браць. Мяркуйце самі.

«Дачка дворніка» (альбо «Бусел») сціскала рукі, шыю, ногі жалезнымі пласцінамі. Праз некалькі хвілін у ахвяры пачынаўся спазм цягліцаў каля жывата, затым спазм ахопліваў усё цела.

«Крэсла для допыту» было ўсё ў шыпах. Чалавек, які на ім сядзеў, не мог паварушыцца. У супрацьлеглым выпадку шыпы ўпіваліся ў цела.

Пры дапамозе «Маліто́ўнага крыжа» чалавека фіксавалі ў нязручнай крыжападобнай позе. Гэта дапамагала цалкам падпарадкаваць ахвяру волі катаў.

«Скрыпка пляткарак». Гэты сродак пакарання не прыводзіў да фізічнага калецтва. Але знаходжанне локцяў сагнутымі працяглы час прыносіла вялікі боль.

Ці стала чалавецтва больш гуманным ад часоў Сярэднявечча? Хутчэй, стала больш крывадушным: цяпер на допытах б'юць мяхамі з пяском, каб не было відаць слядоў, душаць пластыкавымі пакетамі. ...І ўсё ж з музея ў сваё стагоддзе выходзіш з пачуццем палёгкі.

Выстава працуе ў Нацыянальным гістарычным музеі (Маркса, 12).

**Кастусь Матушыч**

## Сцісла



• **У Мінск прыедзе Элтан Джон.** Папулярны брытанскі рок-спявак, кампазітар, піяніст Элтан Джон выступіць у Мінску з канцэртам. Яго запрасіў беларускі піяніст Расціслаў Крымер, сустрэўшы на прыёме ў Каралеўскай акадэміі музыкі ў Лондане. Днямі Мінск наведаў менеджэр брытанскага музыканта. Ён агледзеў «Мінск-Арэну», дзе 26 чэрвеня і пройдзе канцэрт. Мінімальная цана білета на канцэрт брытанскай знакамітасці будзе складаць 140 тысяч рублёў.

• **Танцавальны «Ляпіс Трубяцкі».** Гурт падвёў вынікі конкурсу танцавальных рэміксаў на песню «Пульс эпохі». На конкурс прыйшло больш за сорак варыянтаў песні. З іх гурт выбраў тузін лепшых. Магчыма, некаторыя кампазіцыі трапяць на еўрапейскі альбом, над якім цяпер працуе «Ляпіс Трубяцкі».



• **Лойка створыць шыльду Геніюш.** Падведзены вынікі конкурсу эскізаў памятнай дошкі ў гонар Ларысы Геніюш. Пераможцам конкурсу стаў скульптар Гэнік Лойка.

• **«Тарас на Парнасе» без купюр.** У выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла кніга з паэмамі Канстанціна Вераніцына «Тарас на Парнасе» і «Два д'яўлы». Творы друкуюцца ў арыгінале, з адлюстраваннем дыялекту мясцовасці, у якой жыў аўтар. У паэме ёсць тры страфы, якія ў савецкі час не ўключаліся ў яе. Праўда, не з ідэалагічных прычын, а з прычыны слабасці. Таксама вернутае ў паэму слова «жыд», якое ў беларускай мове ніколі не несла адмоўнай канатацыі, а ў савецкі час яе набыло.



**Партрэт Міцкевіча пэндзля Хруцкага? Напэўна, так, кажуць мастацтвазнаўцы. Ён з'явіцца ў зборы жывапісу Полацкага гісторыка-культурнага музея. Партрэт быў знойдзены пры падрыхтоўцы выставы праўнучкі Хруцкага сярод яе працаў. Лазерная экспертыза паказала, што час стварэння партрэта — 1850-я. Чакаецца правядзенне мастацказнаўчай экспертызы і рэстаўрацыйных працы.**

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА–версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

## Сайт пра беларускую Смаленшчыну

Смаленск — не Вільня. І ў беларускай нацыянальнай міфалогіі займае значна меншае месца. Аб колішняй беларускасці Смаленшчыны сёння амаль ніхто нічога не ведае.

Сяргей Астанковіч і Фарыд Берашэд, стваральнікі сайта, прысвечанага беларускай спадчыне Смаленшчыны, жадаюць змяніць такі стан рэчаў. «Смаленшчына — адвечная зямля беларускага народа» — прачытае кожны, хто зойдзе на гэтую старонку.

Раздзел «бібліятэка» можа пахваліцца цікавымі матэрыяламі. «Зразумела, што Смаленшчына — гэта этнічная беларуская тэрыторыя, — распавёў «НН» Сяргей Астанковіч. — Аднак цяпер там ужо амаль нічога не засталося, што б сведчыла аб гэтым. Толькі навуковыя даследаванні. Памяць — гэта вельмі важна. Я не лічу, што Смаленшчына вернецца да Беларусі, мы не пераследуем палітычных мэтаў. Хочам толькі выкарыстаць культурную спадчыну Смаленшчыны для беларускай мовы і культуры».

Спадар Астанковіч таксама паведаміў аб планах стварэння падобных рэсурсаў аб Чарнігаўшчыне і Пскоўшчыне.

**Алесь Пілецкі**

IN MEMORIAM

## Вера Рамук



У Чыкага 5 траўня памерла грамадская дзяячка Вера Рамук. Яна на два месяцы пераджыла свайго мужа Вітаўта Рамука, якога не стала 9 сакавіка.

Вера Рамук нарадзілася 6 верасня 1931 г. у Сабарах (сёння Докшыцкі раён, а тады — усходнія крэсы) ва ўніяцкай сям'і Стэфана Жызнеўскага і Еўдакіі Гапанёнак. Бацька быў краўцом, маці — хатняй гаспадыняй. Сям'я мела 12 гектараў зямлі, чатыры каровы, два кані, дзесяць авечак.

Вучылася ў польскай, пасля далучэння Заходняй Беларусі — у савецкай школе. Са школьных гадоў запомніла: «Савет, савет, дай канфет» — мусілі казаць дзеці — і цукеркі з'яўляліся (настаўніца падкідвала). Потым яна загадвала казаць: «Бог, дай пірог». Пірог не з'яўляўся. «От, — рэзюмавала настаўніца, — значыць, Бога няма».

Жызнеўскія былі сярод тых, каго мелі выслаць у Сібір. Высылку прызначылі на канец чэрвеня.

Потым была нямецкая акупацыя, якая ў тых мясцінах дапаўнялася небяспекай пацярпець ад палка Гіль-Радзівонава ці літоўскіх карнікаў.

У 1944 г. Жызнеўскія ўцяклі на Захад. У 1949 г. пераехалі ў ЗША, у штат Ілінойс, у горад Пеорыя.

Тут Вера Жызнеўская скончыла ўніверсітэт і пазнаёмілася з Вітаўтам Рамуком, у 1956 г. яны пажаніліся. У 1963-м перабраліся ў Чыкага. Грамадскае жыццё тут у 1960-я кіпела. Некалькі арганізацый, ажно дзве беларускія царквы — праваслаўная і ўніяцкая парафія Хрыста Збаўцы. Актывістамі і рухавікамі гэтай парафіі былі і Рамукі.

У 1984 г. Вера Рамук як прадстаўнічка беларускай дэлегацыі была запрошана ў Вашынгтон на Тыдзень паняволеных народаў. У Белым доме і пазнаёмілася з прэзідэнтам Рэйганам і нават, набраўшыся адвагі, папрасіла разам сфатаграфавацца.

Да апошняга часу Вера Рамук жыва цікавілася падзеямі ў Беларусі, была падпісчыцай «Нашай Нівы». Але жаданне жыць падарвала смерць мужа. Шмат перажыла ў сваім жыцці, а гэта перажыць не змагла.

Вера Рамук адмовілася прымаць лекі.

**Алег Гардзіенка**

КАЛЯНДАР

## Паўстанка, эмансіпантка, навуковец

Эліза Ажэшка: наша і не наша. Піша **Ліза Кавальчык**.



«У мужыку-беларусу бачыла чалавека і як чалавека шанавала яго». Такой характарыстыкай адгукнулася сто гадоў таму, 18 мая 1910 года, на смерць Элізы Ажэшкі «Наша Ніва». Пісьменніца, народжаная ў падгарадзенскай вёсцы Мількаўшчына, стала класікам польскай літаратуры. Яе «Над Нёманам», «Хам» і «Нізіны» напісаныя на тагачасным беларускім матэрыяле. Але ці з'яўляюцца яны набыткам беларускай літаратуры?

«У шэрагу твораў Ажэшкі гучыць дыялектная беларуская мова, яна цікавілася этнаграфіяй і фальклорам... Добра вядомае прыхільнае стаўленне Элізы Ажэшкі да Францішка Багушэвіча, — кажа Лявон Баршчэўскі. — Разам з тым, яе зацікаўленасць беларускім вынікала з зацікаўленасці вясковым, супрацьпастаўленню яго «сапсаванай» гарадской цывілізацыі».

«Беларусьфільм» актыўна шукае гістарычныя постаці і класічныя творы, прыдатныя для экранізацыі. Анансаваныя «Каласы пад сярпом тваім», чатырохсерыйны тэлефільм пра Янку Купалу. Чаму б не звярнуцца да твораў Ажэшкі? Матэрыял беларускі, эпічныя сюжэты цягнуць на захапляльныя стужкі з галівудскім размахам. Дый сама яе біяграфія, на думку паэта Міхала Анемпадыстава, вартая экранізацыі.

Эпізод 1. Паўстанка. Гісторыкі пагаджаюцца, што ў 1863—1864 гадах Ажэшка дапамагала каліноўцам, чым магла. У прыватнасці, займалася забеспячэннем партызанскага атрада Рамуальда Траўгута, які дзейнічаў на Кобрыншчыне.

Пасля разгрому атрада ў Горацкіх лясах Эліза выратавала цяжка параненага Траўгута: у сваёй карэце адвезла яго да межаў Каралеўства Польскага. Пасля паўстання яе мужа Пётру саслалі ў Сібір, а маёнтак сканфіскавалі. Вымушаная праз усё жыццё маўчаць, пра свой асабісты ўдзел у паўстанні Эліза прызналася блізкаму сябру толькі на схіле жыцця.

Эпізод 2. Эмансіпантка. Агульнаеўрапейскую вядомасць атрымаў раман Ажэшкі «Марта» (1873) — асэнсаваны пратэст супраць нявольніцкага стану жанчыны ў тагачасным свеце. Выснова — «фартэпіяннае» выхаванне паненак не рыхтуе іх да самастойнага жыцця. Да таго ж, у вачах гарадзенскай шляхты пісьменніца была зненавіднай «эмансіпанткай», бо жыла па-за шлюбам з адвакатам Нагорскім, носячы прозвішча пакінутага мужа.

Эпізод 3. Навуковец. Эліза Ажэшка шмат падарожнічала па Беларусі, сабрала 228 назваў раслін. Усім беларускім назвам пры дапамозе знаёмага батаніка яна дала лацінскія адпаведнікі. Дарэчы, шмат назваў раслін, пададзеных Ажэшкай, не фіксуюць іншыя беларускія слоўнікі.

Вось такая польская пісьменніца.

# Генрых Татур: мінскі антыквар і вялікі арыгінал

Піша **Алег Дзярновіч**.

У канцы XIX — пачатку XX стст. у Мінску яшчэ існавала тое спецыфічнае культурнае кола, што захоўвала гістарычную традыцыю Літвы, і для якога была сваёй польскамоўная культура даўняй Рэчы Паспалітай. Адначасова перад гэтай генерацыяй паўставалі новыя культурныя выклікі. Але адчувалася і прысутнасць Расійскай імперыі. Кар'еру, перспектывы прадпрымальніцтва, шмат якія аспекты ўласнага жыцця прыходзілася звязваць з існаваннем у юрыдычным полі манархіі Раманавых. Яшчэ адзін выклік для таго пакалення — малады беларускі нацыянальны праект, што паўставаў з нетраў гэтага краю няпэўнасці. Як да яго ставіцца? Мінскі антыквар і археолаг Генрых Татур апынуўся на перакрыжаванні ўсіх тых сюжэтаў.

### Спробы кар'еры і прага да збіральніцтва

Генрых Татур нарадзіўся ў Мінску у 1846 г. і меў усе шанцы пабудаваць нармальную кар'еру шляхціча панаволенага краю. У даволі маладым узросце ён быў абраны маршалкам шляхты Мінскага павета. Татур актыўна супрацоўнічаў з Мінскім статыстычным камітэтам. Яго ўдзельнікі трымаліся тактыкі рэгіянальнага «пазітывізму» — так можна назваць палітыку прагматычнай працы, скіраванай на развіццё краю ды павелічэнне яго эканамічных і культурных багаццяў. Гэтая палітыка прадугледжвала супрацоўніцтва з расійскімі ўладамі ў вызначаным полі.

Членства ж у Статыстычным камітэце дапамагло Татуру арганізаваць з 1874 г. уласныя археалагічныя даследаванні ў Мінскай губерні і заняцца калекцыянаваннем. Але адным з галоўных вынікаў дзейнасці Татура лічыцца стварэнне ім спачатку ў Бярэзіно, а потым у Мінску прыватнага музея. Ён жа ўпарадкаваў археалагічна-этнаграфічны музей пры Мінскім губернскім статыстычным камітэце.

Карыстаючыся сваім службовым становішчам, доступам да прыватных збораў, Татур меў магчымасць папаўняць сваю калекцыю. Сабраў ён і ўнікальную бібліятэку. Менавіта да Татура трапілі кніжныя зборы зачыненага ўладамі кляштара мінскіх бенедыктынак. Сярод рарытэтаў захоўваліся «Біблія» Скарыны і Статут ВКЛ 1588 г., кнігі з нясвіжскай бібліятэкі Радзівілаў. За трыццаць гадоў Татур сабраў каля 6500 тамоў і рукапісаў XIV—XIX стст.

### Лёс калекцый

Генрых Татур памёр у 1907 г., не пакінуўшы тэстаменту. Смерць заспела яго за складаннем каталогу ўласнай калекцыі. Спадчынай калекцыянера займаліся мінчук Андрэй Снітка і пляменнік нябожчыка Міхал Татур. Яны вялі перамовы з Расійскай Акадэміяй Навук адносна набыцця збораў. Снітка з гэтай нагоды адзначаў: «Што тычыцца набыцця бібліятэкі Татура, мы застаемся пры ранейшым меркаванні: падзяляць яе нельга. У пытанні цаны, мяркую, будзем саступаць. Магчыма, што мясцовыя выданні я цаню вышэй сапраўднага кошту, бо яны прымушаюць біцца маё беларускае сэрца...»

Сведкі падзей прыгадвалі, што пасля смерці Татура бібліятэка знаходзілася «ў поўным разгроме»: «частка кніг і рукапісаў на паліцах, частка ляжыць у скрынях, шмат чаго валяецца на падлозе; тут карты ў скрутках, малюнкі, альбомы, газеты». Гэта цытата з даклада філолага Вячаслава Сразнеўскага ў Акадэміі Навук, зробленага пасля азнаямлення з бібліятэкай і музеем Татура на ўскраіне Мінска, у Лагойскім завулку, дом № 8.

Асобныя прадметы калекцыі пачалі разыходзіцца. Так, удава Татура перадала праваслаўнаму епіскапу абраз з былога Лагойскага манастыра. Епіскап загадаў убраць абраз у рызу («на жаль, падмаляваў!», адзначаў Снітка) і ўрачыста, з хросным ходам, аднёс у царкву ў Лагойску.

Акадэмія Навук, урэшце, не знайшла сродкаў на набыццё збораў Татура. Так ці інакш, яго калекцыі пакінулі Мінск. Граф Тышкевіч выкупіў частку кніжных збораў і адвёз у маёнтак Красны Двор пад Вільняй. Адтуль кнігі трапілі ў віленскія архівы. Іншая частка збораў трапіла ў музей Уніі, які стварыў мітрапаліт Шаптыцкі ў Львове. Хадзілі чуткі, што некаторыя матэрыялы былі вывезеныя ў Германію.

### Сталыя фінансавыя праблемы

Той жа Сразнеўскі сцвярджаў, што Татур быў «беларус-нацыяналіст і вораг палякаў». «Не маючы асаблівых прыбыткаў, ён калекцыянаваў з дапамогай сваіх жа збораў: купляў затанна ўсялякія рэчы і прадаваў задорага тое, што не мела найбліжэйшых адносін да Беларусі... Татур звычайна перабольшваў цану сваіх рэчаў і любіў у гэтым сэнсе пасмяяцца з нашчадкаў радавітых фамілій, прапануючы сёння аддаць рэч за тысячу і даючы час на роздум, пасля якога абяцаў ставіць цану ўдвая большую».

Часам калекцыянер змушаны быў даваць рэчы ў заклад пад грошы. У архівах захавалася распіска, якая апісвае вяртанне Татурам паловы пазыкі: «Сп. Генрыхам Татурам з занятых у спн. Міхаліны Драздоўскай і Антаніны Пякарскай грошай дзвесце рублёў серабром 20 красавіка 1870 года сплаціў сто рублёў серабром і звыш *гэтага* на працэнт другога года даўшы дзесяць рублёў; з закладзеных жа каштоўнасцяў прыняў назад: пярсцёнак з трыма дыямантамі адзін; і перламутравую табакерку. Іншыя ж каштоўнасці... застаюцца ў нашым захаванні — да моманту іх выкупу». Як бачым, Татур аддаваў свае пазыкі.

### Ля пачаткаў беларускага руху

Пасаж Сразнеўскага пра нацыяналізм Татура заслугоўвае асаблівай увагі. Наколькі гэты антыквар і калекцыянер сапраўды мог мець нейкае дачыненне да беларускага руху? Ці не перабольшванне гэта?

Рэдактар «Нашай Нівы» Аляксандр Уласаў у сваіх успамінах нечакана адзначаў ролю Татура ў юнацкія гады яго і Івана Луцкевіча:

«Мы хлапцамі разам з Казімірам Кастравіцкім [Карусём Каганцом] сядзелі ў музеі Татура, сотні разоў расказвалі яму свае «беларускія» планы. Строгі стары, лысы, з рудой барадой, падобны да прарока Елісея, быў з намі аднoй думкі. Седзячы гуртом на змярканні ў яго музеі, заваленым кальчугамі, мячамі, старымі кнігамі, дакументамі, мэбляю, абразамі, ён выслухоўваў нашы «даклады» аб нашых нясмелых яшчэ спрэчках з палякамі і абрусіцелямі, даваў заўвагі: «разумна адказалі!»... «гэта пусты чалавек!...» Прыводзіў нам аргументы з гісторыі Беларусі. Кастравіцкі быў духам з «беларускай пушчы», з народа: ад Татура веяла на нас духам Гедыміна, Ягайлы, Канстанціна Астрожскага, Менскіх, Слуцкіх і ўсіх фундатараў і будаўнікоў беларускай мінуўшчыны. Гэта былі два магіканы, дзве крыніцы, каторыя перахавалі зародыш беларускай ідэі і не далі ёй загаснуць».

У гэтых успамінах знаходзім і адзінае апісанне самога Татура: яго фота ў архівах пакуль не адшукана.


Kraków 16/XI 94.

Łaskawy Panie! Ostatnie paki z książkami odprawiam do Krakowa 1/XII więc ani Elzewirów ani Katalogu, ani części niestety będę druki nabywać potem. Czuję się więc obowiązany, przekonany że wyższej ceny Pan za nie od znanych mi zbieraczów nie otrzymasz, Panu moje ceny zakomunikować. Zostawiłem pańską ręką pisaną karteczkę z cenami i z niej te kwoty wypisuję. Jeżeli moich cen nie przyjmiesz nie ma co druki tu wozić — jeżeli się na nią zgadzasz to proszę o rychłe przywiezienie tych druków bo ostatnie paki się zabija. Defektów nie biorę.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Evangelie Kochmanowo, Krylos | 120 | 180 | 180 |
| | | 50 | 50 |
| Baranowicza | 40 | 25 | 20 |
| Makarij Wilno | 20 | — | 20 |
| Awar. Kiev | 15 | — | 20 |
| Trefolog Kutein | 20 | 30 | 20 |
| Oktoich 1718 | 5 | 5 | 5 |
| Trepka Kamionka ... | | | 200 |

Summa facit 420 Rubli

**На гэтым лісце Юрыя Чапскага да Генрыха Татура відаць, як адбываліся перамовы аб набыцці каштоўнасцяў. Справа ад прапанаванай Чапскім цаны Татур упісаў алоўкам сваю, вышэйшую за першапачатковую. Яшчэ правей — канчатковыя цэны (1894 г. Публікуецца ўпершыню.).**

### Мінскі рынак антыкварыяту

Гімназісты Іван Луцкевіч і Аляксандр Уласаў прыходзілі да Татура, праўдападобна, на вул. Гандлёвую на ўзбярэжжы Свіслачы. На гэты ж адрас (вул. Гандлёвая 5, 6, 8) паступала і карэспандэнцыя ад кліентаў і пакупнікоў Татура.

У сталых зносінах Татур быў з Чапскімі. Галава сям'і Эмерык Гутэн-Чапскі ў свой час свядома будаваў кар'еру расійскага чыноўніка, у самы разгар паўстання 1863 г. пагадзіўся заняць пасаду губернатара Ноўгарада Вялікага. Вяршыняю ж яго кар'еры стала пасада дырэктара Ляснога дэпартамента Расіі, але праз інтрыгі і пагаршэнне адносін з царом з-за бескантрольнай раздачы лясоў Чапскі сышоў з дзяржаўнай службы і прысвяціў сябе калекцыянаванню. Свае найбагацейшыя калекцыі Чапскі вывез з падкойданаўскага Станькава ў Кракаў. Цяпер даследчыкі гэта матывуюць немагчымасцю стварыць публічны музей гісторыі краю ў Мінску.

Заслужаным перад Мінскам быў старэйшы сын Эмерыка, Караль Чапскі. Ён чатыры разы абіраўся гарадскім галавою. Дзякуючы яго актыўнай дзейнасці, Мінск ператварыўся ў новаеўрапейскі горад. У справах жа калекцыянавання Чапскіх Татур зносіўся з малодшым сынам Эмерыка Юрыем Чапскім. Менавіта яму Татур прапаноўваў некаторыя кніжныя рарытэты. Нашы героі таргаваліся за некалькі выданняў XVII ст. з такім імпэтам, што ўрэшце Чапскі напісаў Татуру: «Дарагі Пане! Ёсць ты ўпартым і цвёрдым, як скала». І прыняў прапанаваныя ўмовы здзелкі.

У 1899 г. Татур вёў перамовы з Антоніем Радзівілам адносна даспехаў для калекцыі ў Нясвіжскім замку. Відаць, Татур прапаноўваў нясвіжскаму ардынату набыць поўны даспех коннага рыцара з радзівілаўскім гербам на грудзях за 16 тыс. рублёў. Гэта была велізарная сума! 21 верасня прадстаўнік Управы Радзівіла рэзка адказаў Татуру, што «з-за надта высокай цаны на зброю Яго Светласць Князь Ардынат не жадае яе набыць».

У пасмяротным апісанні калекцый мінскага антыквара фігуруе гэты «велізарны рыцар на кані». Куды ён «паскакаў» пасля смерці Татура? Як не засталіся ў Мінску і іншыя рарытэты калекцыі гэтага вялікага арыгінала.

# Расійскі бізнэсоўца скупляе беларускія сядзібы

Новы гаспадар палаца ў Красках замахнуўся на суседні маёнтак у Падароску.

У самым пачатку 2010 года праз усе СМІ прабегла навіна — расійскі бізнэсоўца выкупіў палац XIX стагоддзя ў Красках, што на Ваўкавышчыне. Гэта быў фактычна першы прыклад «прыватызацыі» гістарычнай спадчыны. На рэканструкцыю адвялі два гады. З іх прайшло ўжо паўгода. Што змянілася за гэты час? Сядзіба дачакалася рэканструкцыі ці новы гаспадар нагуляўся ў гісторыю і плюнуў на палац?

## З Красак на Берлін

Краскі сустракаюць прыезджых закінутымі хатамі і атмасферай суцэльнага вымірання. Як і ў большасці іншых вёсак, моладзі тут фактычна не засталося. Толькі некалькі бабулек, што сядзяць уздоўж дарогі, забіваюць доўгія вечары бясконцымі размовамі.

Каля павароту на палац па мясцовых мерках шматлюдна — чатыры чалавекі. Мужчына рашуча набліжаецца да машыны: «Вы ў замак? Праезд закрыты. Прыватная ўласнасць». — «А вы хто?» — «Ахова». «Ахоўнік» рашуча даводзіць, што гаспадар адпачывае, а таму праезд далей закрыты. Маўляў, лепш выбірацца, пакуль жывыя-здаровыя.

Перамовы ні да чаго не прыводзяць, таму, ускочыўшы ў старэнькі «Фальксваген» з наклейкай «на Берлін!», ахоўнік кідаецца ў імправізаваную пагоню, якая канчаецца каля заезду ў парк. Тут — другі этап перамоў. З кішэні ў «ахоўніка» звісае рацыя, якая, на дзіва, працуе. Для сувязі з Генадзевічам. Ён быў не супраць, каб прэса ціхенька агледзела маёнтак.

## Генадзевіч

«Генадзевіч» — той самы расійскі бізнэсоўца Вадзім Селіхаў, які купіў стары панскі маёнтак за 300 мільёнаў рублёў ($100 тысяч). За гэтыя грошы ён атрымаў некалькі прыбудоў савецкага перыяду, закінуты, зарослы панскі парк і — галоўнае — разрабаваны палац у аварыйным стане.

Гісторыя сядзібы падобная да лёсаў дзясяткаў архітэктурных помнікаў па ўсёй Беларусі. Палац, пабудаваны ў 1839 годзе, перажыў часы свайго росквіту ў пачатку XX стагоддзя. Тады ж была дабудаваная частка палаца з вежай. Савецкі час не пашкадаваў Краскі. У будынку размясціўся спачатку касцёвасухотны, а пасля лёгачны санаторый. Некаторы час у панскім маёнтку жылі алкаголікі — тут быў лячэбна-працоўны прафілакторый. З часу незалежнасці будынак пачаў развальвацца і стаяў у аварыйным стане. І тут замаячылі перспектывы атрымаць расійскія інвестыцыі.

Новы пан збіраецца перабрацца у Краскі, каб жыць тут пастаянна, але пакуль што не можа атрымаць від на жыхарства. Вось і катаецца пастаянна туды-сюды. Тыдзень адпачынку ў Красках — месяц працы ў Расіі. Пакуль замак непрыдатны для жылля, каля яго ўзвялі драўляную пабудову, дзе і жыве расіянін з сям'ёй. На акне спадарожнікавая талерка — нават у лесе нельга заставацца адарваным ад жыцця. Гаспадар з гасцямі тым часам рабілі шашлыкі. Не настроены на размову, ён памахаў рукой здалёк: «І вам добры дзень! Толькі не называйце мяне алігархам, я ж нармальны чалавек». У Расіі гэта прэстыжна, а ў Беларусі небяспечна — улада не любіць алігархаў.

Ахоўнік Валодзя з гонарам за гаспадара зазначае: «Госці ў яго ого-го! У Беларусі такіх бізнэсоўцаў няма». Ахову, як і іншых работнікаў, Генадзевіч набраў з мясцовых. Працоўных месцаў у вёсцы няма, таму прыходу расійскіх інвестыцый тут чакаюць з нецярплівасцю. Пра новага гаспадара адклікаюцца выключна станоўча: «Не пішыце пра яго дрэнна, а то прыязджалі тут, панапісвалі...»



Палац, прыгожы звонку, але занядбаны ўнутры.



Тыповы пакой у палацы.

## Флігель — парк — палац

Валодзя тым часам праводзіў экскурсію па маёнтку і расказваў, якія працы ўжо пачаліся. «Пакуль што знеслі некалькі прыбудоў савецкага часу. Усё павінна быць так, як было ў пана, таму хадзілі і шукалі па хатах старыя фотаздымкі і планы, што засталіся з пачатку стагоддзя», — кажа ён. Пасля заводзіць у флігель, дзе аднаўленне ўжо пачалося.

«Выявілася праблема: мала таго, што няма архітэктараў, дык не засталося нават чырванадрэўшчыкаў! Ні ў Ваўкавыску, ні ў суседніх гарадах. Знайшлі толькі ў Шчучыне», — скардзіцца Валодзя. Працуюць пакуль што толькі мясцовыя жыхары, але калі нарэшце рукі дойдуць да палаца, то гаспадар прывязе прафесійных будаўнікоў.

Наступным пунктам працы на шляху вяртання да арыгінальнага выгляду мае стаць парк. За стагоддзе ён фактычна пераўтварыўся ў лес. А раней на шасці гектарах раслі экзатычныя дрэвы, якія дарэвалюцыйны гаспадар Зігмунт Сейгень прывозіў з усяго свету. У глыбіні парку быў вадаём, аддзелены тапалінай алеяй.

## З прыцэлам на Падароск

У самім палацы будаўнічыя працы толькі-толькі пачаліся. Дзе-ні дзе пакладзена новая цэгла, у куце аднаго з пакояў ляжаць рэшткі панскай падлогі. З савецкай спадчыны засталася размаляваная сцяна з бярозкамі. Яе будуць ламаць у першую чаргу.

Лесвіца, што вядзе з першага паверха на другі, калісьці была выкладзеная чырвоным дрэвам. «Мы, як былі дзецьмі, нават ступіць на яе баяліся», — расказваюць бабулі ў красаўскіх хатках. «Сцяна побач з ёй увогуле трымаецца на сумленным слове. Прыйдзецца зносіць, а пасля зноў будаваць», — кажа Валодзя.

У палацы агулам больш за дваццаць пакояў. Тут зможа размясціцца і Генадзевіч з сям'ёй, і шматлікія госці. Мясцовыя жыхары кажуць, што бізнэсоўца збіраецца выкупіць яшчэ адну сядзібу, у суседнім Падароску. Там мае адкрыцца гасцініца, з якой і будуць вазіць турыстаў у Краскі.

Чаму Генадзевіч абраў менавіта Ваўкавышчыну, не ведае ніхто. Здаецца, і беларускіх каранёў у яго няма, і ад Расіі далёка, але ж грошы вырашыў ён укласці менавіта сюды. Нашчадкаў апошняга ўладальніка сядзібы Зігмунта Сейгеня, якія, мабыць, з большай ашчадай ставіліся б да палаца, так і не знайшлі. Пакуль што працы праводзяцца непрафесіяналамі, і ніхто не можа гарантаваць, што, зачапіўшы нейкую сцяну, яны не абваляць помнік архітэктуры. З іншага боку, у Селіхава яшчэ ёсць час, каб укласціся ў план рэканструкцыі і выканаць абяцанні, дадзеныя ваўкавыскім чыноўнікам.

У любым выпадку сітуацыя з Краскамі сфарміруе грамадскае меркаванне пра прыватызацыю гістарычных помнікаў.

**Яўген Васількоў, фота аўтара**




**Як даехаць да Красак?**

Ад Мінска зручней за ўсё ехаць па трасе М1 да Івацэвічаў, далей праз горад выехаць на трасу Р78. Там праз Косава і Ружаны 60 км да Падароска — вёска знаходзіцца прама ўздоўж дарогі. Адразу перад панскай сядзібай паварот налева. Некалькі паваротаў па ёй — вось і Краскі. Паварот на маёнтак будзе направа, каля яго звычайна стаіць машына аховы.

Іншы варыянт: ехаць ад Ваўкавыска 25 км па той самай Р78, за сядзібай у Падароску зварочваць направа.

**Што паглядзець па дарозе?**

**Ружаны** — палацавы комплекс Сапегаў, Троіцкі касцёл

**Косава** — палац Пуслоўскіх, сядзіба Касцюшкі

**Слонім** — манастыр бернардзінцаў XVII ст., сінагога таго ж часу, касцёл св. апостала Андрэя

**Жыровічы** — Успенскі сабор

**Сынкавічы** — царква св. Міхаіла Архангела

**Зэльва** — магіла Ларысы Геніюш



**Не алігарх**

Вадзім Селіхаў — расійскі бізнэсоўца з горада Салехард (Ямала–Ненецкая аўтаномная акруга). Гэта 3000 км ад Беларусі. Па колькасці насельніцтва горад падобны на Ваўкавыск.

У бізнэсе з пачатку 1990-ых гадоў. Разам з кампаньёнамі арганізаваў гандлёвы салон «Камфорт+», які спецыялізаваўся на рамонце, дызайне інтэр'ера і ўстаноўцы тэлефонных станцый. На базе салона сталі займацца аб'ектамі харчавання, маюць ва ўласнасці бар і рэстаран у Салехардзе, а таксама кавярню ў будынку адміністрацыі аўтаномнай акругі. У 2000 стаў стваральнікам рыэлтарскай кампаніі. Выдаткоўваў грошы на развіццё дзіцячага тэніса ў Салехардзе.

Мае жонку і сына. Брат Сяргей прафесійна гуляе ў прэферанс і адзін час увакодзіў у 50 лепшых гульцоў Расіі.







## КАНЦЭРТЫ

### Турнэ «Океана Ельзи»

«Океан Ельзи» наведае Беларусь падчас тура ў падтрымку новага альбома «Dolce Vita». Маршрут украінскіх музыкаў выглядае наступным чынам: **Баранавічы (15 мая), Гродна (16 мая), Гомель (18 мая), Брэст (19 мая)**. А **22 мая** «ОЕ» выступіць разам з **Горанам Брэгавічам** у якасці хэдлайнераў на трэцім рок–фестывалі «Stare Misto» **ў Львове**. 8–гадзінны канцэрт пройдзе **на мясцовым стадыёне «Украіна»**.

## ІМПРЭЗЫ

### Фотафорум-2010

**Да 14 мая ў «БелЭкспа» (вул. Я. Купалы, 27)** — 4–ы фотафорум. Гэтым разам выставачная актыўнасць засяродзіцца вакол асноўных цэнтраў: экспазіцыі Мінскага фотасалона і фоташоу ад асноўных прафесійных студый.

### Рытмы і рыфмы

**20 траўня ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі** адбудзецца вечар сучаснай беларускай песні і паэзіі «Рытмы і рыфмы» з удзелам Таццяны Беланогай, Юрыя Несцярэнкі і Віктара Шалкевіча. Вядучы мерапрыемства — Мюр Фарыдовіч. Спецыяльны госць — пісьменніца Людміла Рублеўская. **Пачатак а 19-й.**

### Прэзентацыя «Беларусаў у Вялікабрытаніі»

**У пятніцу (14 мая) у «Гістарычнай майстэрні» (Мінск, вул. Сухая, 25 — ст. метро «Фрунзенская»)** пройдзе прэзентацыя кнігі Наталлі Гардзіенкі «Беларусы ў Вялікабрытаніі». **Пачатак а 19-й.**

## ВЫСТАВЫ

### Ноч музеяў

**15 мая Мастацкі музей** возьме ўдзел у міжнародным арт–праекце «Ноч музеяў». **Ад 19.00 да 00.00** музей запрашае на «Вечар у французскім стылі».

### Шагал і мастакі еўрапейскага авангарда

**У Мастацкім музеі** працуе выстава «Шагал і мастакі еўрапейскага авангарда», на якой экспануюцца творы Анры Маціса, Хуана Міро, Жоржа Брака, Пабла Пікасо, Фернана Лежэ, Марка Шагала… **Выстава працуе да 23 мая.**

### Вадаварот часу

**Гістарычны музей на «Ноч музеяў» (15 мая)** прадставіць для дэманстрацыі **на працягу адной гадзіны (19.00 — 20.00)** унікальны аб’ект уласных фондаў, што будзе экспанавацца ўпершыню. **Ад 20-й да 23-й у Вялікай зале музея** пройдзе касцюміраваная і тэатралізаваная праграма «Баль у гонар В.Ваньковіча», якая будзе рэканструяваць баль пачатку XIX ст. У экспазіцыйнай зале «Старажытная Беларусь» — інтэрактыўная дзея «Ажыўлены музей». Рыцары навучаць усіх ахвотных танцам 15—16 стагоддзяў, пазнаёмяць з асновамі этыкету, таксама прагучыць старадаўняя музыка… У зале, прысвечанай гарадской культуры XIX — пачатку XX стст., з дапамогай персанажаў тых часоў ажыве атмасфера Мінска таго часу. Унутраны двор музея стане пляцоўкай для танцавальнага марафона. **А 19-й** адбудзецца ўрачыстае адкрыццё танцавальнай пляцоўкі, дзе можна будзе ўзяць удзел у гульнях і атракцыёнах. Пачаты папярэдні продаж квіткоў.

### Вяселле — non stop

**У Музеі Багдановіча (вул. Багдановіча, 7а) 15 мая ад 12-й да 22-й** — «Вяселле — non stop». **Ад 12-й да 15-й** для дзяцей — паказ батлеечных спектакляў, адначасова ў фае — інтэрактыўныя заняткі, гульні, забавы. **Ад 15-й да 18-й** — гульня–выпрабаванне «У лабірынце кахання». Удзельнікам прапануецца прайсці праз «лабірынт экспазіцыйных залаў», у кожнай зале выканаць разнастайныя заданні, конкурсы, пераадольваючы «перашкоды на шляху да сямейнага шчасця». Адначасова ў выставачнай зале можна паслухаць экскурсіі па выстаўцы, пазнаёміцца з вясельнымі традыцыямі беларусаў. **Ад 18-й да 20-й** — паэтычна–музычны «Гімн каханню», праграма разлічана на моладзевую і дарослую аўдыторыю. **А 20-й** — танцавальны спектакль «Кола фартуны ці легенда пра Барбару Радзівіл». Па завяршэнні спектакля — майстар–клас «Дзіўныя танцы кахання», дзе сапраўдныя майстры танцавальнага мастацтва паспрабуюць кожнага ўдзельніка навучыць танчыць і праз танец умець перадаваць свае пачуцці. Уваход платны. Бясплатны ўваход для дзяўчат, апранутых у белыя сукенкі, для мужчын, у гардэробе якіх прысутнічае гальштук–матылёк.

### Фотавыстава Лянкевіча ў Варшаве

Выстава–прэзентацыя здымкаў Андрэя Лянкевіча, прысвечаная выбітным беларусам, якія жывуць у Польшчы, пройдзе **17 мая ў кавярні «Mesita» (ul. Sienna 93, Warszawa)**. **Адкрыццё а 19-й.**

### Іканапіс XVI-XIX стст.

**Да 23 ліпеня ў Мастацкім музеі** працуе выстава «Святыя заступнікі ў праваслаўным іканапісе XVI—XIX стагоддзяў».

### Жывапіс у Нармандыі

**У Мастацкім музеі да 25 мая** працуе выстава «Жывапіс у Нармандыі». Гэты ўнікальны збор твораў мастацтва вандруе па свеце як калекцыя, якая паказвае зараджэнне імпрэсіянізму ў Францыі.

## КІНО

### Кашмар на вуліцы Вязаў

**A Nightmare on Elm Street**
ЗША, 2010, каляровы, 95 хв.




**Рэжысёр:** Сэмюэл Бэер
**Ролі выконваюць:** Джэкі Эрл Гейлі, Кайл Гэлнер, Руні Мара, Кэці Кэсідзі, Томас Дэкер, Келан Луц
**Жанр:** Фільм жахаў
**Адзнака:** 4 (з 10)

Група падлеткаў сніць аднолькавы кашмар. Уначы да іх прыходзіць абпаленая пачвара з жалезнымі кіпцюрамі — Фрэдзі Кругер. Героям варта паспяшацца, каб спыніць істоту: паміраючы ў сне, яны паміраюць наяве.

Карціна — паўтор слыннай стужкі 1984 года. Фрэдзі Кругер з таго часу стала прапісаўся ў масавай культуры — фільм перажыў сем працягаў. Праз 26 гадоў гісторыю вырашылі аднавіць. «Ён палохаў вашых бацькоў, цяпер ён прыйдзе за вамі», — абвяшчае рэклама.

Нязменнага Роберта Энглунда, які іграў Фрэдзі, змяніў Джэкі Эрл Хейлі, здольны граць пачвару і без усялякага грыму. Цікава, што ў першых «Вязах» Хейлі прагнуў сыграць падлетка, але ягоная роля дасталася Джоні Дэпу.

Аднак фільм не ўражвае. Акторы занадта дарослыя для падлеткаў. Карціна вялая і палохае ў асноўным рэзкімі гукамі.

**Андрэй Расінскі**




## ТЭАТРЫ

**13 мая**

**Тэатр юнага гледача** — «Апошняя дуэль»
**Купалаўскі тэатр** — «Дзеці Ванюшына»
**Тэатр імя Горкага** — «Свабодны шлюб»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Тэатр оперы і балета** — «Іаланта»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»

**14 мая**

**Тэатр оперы і балета** — «Шчаўкунок»
**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з прыдуркам»
**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»
**Тэатр юнага гледача** — «Мешчанін у шляхецтве»
**Тэатр лялек** — «Дом, што збудаваў Свіфт»

**15 мая**

**Тэатр лялек** — «Чароўная лампа Аладзіна»
**Тэатр імя Горкага** — «Царэўна–жабка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Гісторыя двух сабак»
**Тэатр юнага гледача** — «Маўглі»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзькаў сон»
**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»

**16 мая**

**Тэатр лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»
**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Варшаўская мелодыя»
**Тэатр оперы і балета** — «Пакліканне — опера!»
**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»

**18 мая**

**Тэатр імя Горкага** — «Я веру ў гараскопы»
**Купалаўскі тэатр** — «Больш чым дождж»
**Тэатр оперы і балета** — «Спячая прыгажуня»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Яго апошняе каханне (Лета)»

**19 мая**

**Тэатр імя Горкага** — «Ад’ютант–Ша Яго Вялікасці»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Тэатр імя Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»
**Тэатр оперы і балета** — «Рыгалета»
**Купалаўскі тэатр** — «Хам»

**20 мая**

**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Купалаўскі тэатр** — «Хам»

**21 мая**

**Тэатр лялек** — «Гісторыя аднаго горада»
**Тэатр юнага гледача** — «Тарас на Парнасе»
**Тэатр імя Горкага** — «Уяўны хворы»
**Купалаўскі тэатр** — «Не мой»
**Тэатр оперы і балета** — «Шапеніяна», «Пахіта», «Балеро»

**22 мая**

**Тэатр лялек** — «Прыгоды Пін–Піна»
**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Квакі і квокі»
**Тэатр імя Горкага** — «Зоркі сёмага неба»
**Купалаўскі тэатр** — «Не мой»
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»

**23 мая**

**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр лялек** — «Піпі–Доўгаяпанчоха»
**Купалаўскі тэатр** — «Афрыка»
**Тэатр оперы і балета** — «Стварэнне свету»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Купалаўскі тэатр** — «С.В.»
**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына»

## ДЫСКУСІЯ

### Готы і неўры на Палессі

**14 мая** адбудзецца семінар таварыства «Загароддзе». **Пачатак у 18.45.** Даклады: «Готы на Палессі». Выступовец: В.Белявец. «Неўры Герадота на Палессі». Выступовец: І.Данілюк. **Месца правядзення: Беларускі ПЭН-Цэнтр, вул.Казлова, 7-101.**

# Белкарт, Віза і Мастэркард — хто каго?

У Беларусі зарэгістравана больш за восем мільёнаў банкаўскіх картак. Некаторыя беларусы маюць па дзве-тры карткі. Асноўныя банкаўскія сістэмы — гэта «Віза» і «МастэрКард». Але год таму з'явіўся трэці канкурэнт — «Белкарт». У чым асаблівасці кожнай з сістэм?

### І не трэба, і выкінуць шкада

Нацыянальная сістэма «Белкарт» была створаны апошняй, але яе доля на рынку імкліва расце з дапамогай адміністрацыйных метадаў. Карткі «Белкарт» выдаюць як даважку да «візаўскіх» картак. Так, па стане на красавік 2010 года ў звароце знаходзілася 2 014 млн картак «Белкарт». Гэта больш за чвэрць ад агульнай колькасці. Год таму было менш за 10%. Да праграмы ўжо далучыліся 13 банкаў.

Неабходнасць яе стварэння начальнік управлення агульнасістэмнага развіцця «Банкаўскага працэсінгавага цэнтра» Аляксандр Глушакоў тлумачыць так: «Плацяжы пры карыстанні міжнароднымі сістэмамі ідуць праз міжнародныя банкі, а Беларусь вымушана плаціць за гэта валютай».

Знешне беларуская картка не адрозніваецца нічым. Хіба надпіс на ёй зроблены кірыліцай, а не лацінкай. «НН» пісала, як нашыя чытачы дамагліся, каб на іх картках надпіс быў па-беларуску, з «і», «ў» і апострафам.

### Не замест, а разам

«МастэрКард»і «Віза» былі створаныя яшчэ ў 1960—1970-я. Маючы на дзвюх 83% ад сусветнага абароту пластыкавых банкаўскіх картак, яны без праблем утрымліваюць лідэрскія пазіцыі і ў нашай краіне. Кампаніі адмаўляюцца называць свае долі на беларускім рынку. Застаецца толькі рабіць прагнозы.

Галоўная функцыянальная перавага абедзвюх сістэм у параўнанні з «Белкартам» — магчымасць разлічыцца па-за межамі краіны. Яны, дарэчы, дазваляюць адкрываць рахунак у беларускіх рублях ці далярах. А ў выпадку з «Візай» яшчэ і ў еўра.

З іншага боку, усяго 1% ад усіх транзакцый, якія здзяйсняюцца беларускімі карткамі, прыходзяцца на замежжа. Беларусам прасцей выправіцца за мяжу з наяўнымі ў кішэні і не плаціць камісійны збор —2—4% ад здыманай сумы ў банкамаце.

А вось дзве ўзаемазамяняльныя карткі — даволі выгадная рэч. Беларусы знайшлі плюсы ў гэтай сітуацыі. Напрыклад, адну картку бярэ сабе муж, другую — жонка, што дазваляе карыстацца рахункам адначасова. Хоць па інструкцыях банкаў плацяжы могуць прымацца толькі ад уласніка карткі. Але на гэтую акалічнасць звычайна не звяртаюць увагу.

У дадатак, калі картка зламаецца ці згубіцца, можна часова карыстацца іншай.

**Яўген Васількоў**




СТЫЛЬ

## Пакажы сваю цішотку і я скажу, хто ты

### Дзе знайсці майку на лета з надпісам па-беларуску?

Цішоткі з «Пагоняй» можна пабачыць на Управе партыі БНФ (Машэрава, 8). Таксама пра іх можна запытацца на офісах ТБМ (у Мінску гэта Румянцава, 13). Тамсама можна пабачыць «Цішотку вольных беларусаў».

Каштуюць такія майкі ў Мінску каля 25 тысяч рублёў.

«Цішоткі вольных беларусаў» — гэта вынік інтэрнэт-конкурсу сярод маладых дызайнераў на найлепшае афармленне летняй апранахі. Яны вылучаюцца нетыповымі надпісамі: «Не будзь трусам, будзь сапраўдным беларусам», «Беларусь. Яна і ў Афрыцы Беларусь...» і г.д.. Іх можна замовіць у інтэрнэт-краме prastora.by ці распытацца, як дастаць, па т.: (029) 782-88-81. Каштуюць яны па 25—30 тысяч.




Таксама існуе дызайнерская калекцыя ад рэкламнага агенцтва «Адліга»: «Чыста па-мінску», «Вялікае Тысячагоддзе Вялікай Літвы», «Z яшчэ вернецца!», «colorадская пушча» і г.д. Яны каштуюць па 40—80 тысяч рублёў. Набыць гэтыя цішоткі можна ў магазіне-галерэі «Падземка» (Незалежнасці, 43), «Славутыя майстры», (Камунальная набярэжная, 6б), Галерэі сучаснага мастацтва «Ў» (Незалежнасці, 37а). Таксама іх можна замовіць паштовай замовай у любую кропку свету праз інтэрнэт-краму «Кнігі поштай» (knihi.net).

**Настасся Шамрэй**

ЗДАРОЎЕ

## У басейнах не вірусы, а іх абломкі

Міністэрства аховы здароўя ў адказ на інфармацыю пра вірусы небяспечных хваробаў, знойдзеныя ў вадзе мінскіх басейнаў, заявіла, што такія навуковыя даследаванні вады ладзяцца рэгулярна. У выніку ў вадзе плавальных басейнаў Мінска не былі выяўленыя непасрэдна самі вірусы, а толькі іх генетычныя і бялковыя маркеры. Гэта «абломкі» вірусаў, не здольныя выклікаць інфекцыю ў чалавека.

Па словах Мінздароўя, выяўленне гэтых маркераў не сведчыць пра заразнасць віруснага матэрыялу.

Раней паведамлялася, што ў 15% пробаў вады з плавальных басейнаў Мінска выяўленыя вірусы. Сярод іншых называліся вірусы гепатыту А і энцэфаліту. Выяўленыя яны былі як у дарослых, так і ў дзіцячых басейнах.

**СМ**

БЕЛАРУСЬ—ЕС

## Еўрасаюз дапамагае жыхарам Чарнобыльскай зоны

Еўрасаюз выдзеліць каля 1,5 млн еўра на павышэнне ўзроўню жыцця ў беларускіх рэгіёнах, пацярпелых ад Чарнобыльскай аварыі. У першую чаргу будуць падтрымлівацца ініцыятывы жыхароў забруджаных раёнаў.

У пацярпелых раёнах з'явяцца гурткі і секцыі для дзяцей, спортзалы для інвалідаў, дамбы супраць вясновых разліваў рэк.

Дзякуючы ўвазе Еўрапейскага Саюза і ААН да патрэбаў жыхароў Веткі, у горадзе, дзе жыве 1,5 тысячы дзяцей, цяпер ёсць і футбольнае поле, і дзіцячая пляцоўка. Гэта будаўніцтва абышлося амаль у 18 тысяч даляраў.

Добраўпарадкаванне гэтай тэрыторыі для здаровага ладу жыцця стала магчымым дзякуючы ініцыятыве саміх жыхароў горада. Веткаўцы прапанавалі ідэю, а Еўрасаюз прафінансаваў яе ўвасабленне ў рамках праекта «Тэрытарыяльна арыентаванае развіццё рэгіёнаў, пацярпелых у выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС».

У вёсцы Галіч Веткаўскага раёна 27 красавіка адкрылася першая ў наваколлі спартыўная школа. У рамках таго ж праекта было адрамантавана памяшканне, якое да таго больш за 10 гадоў пуставала, закуплены спартыўны інвентар, арганізаваныя футбольная і валейбольная пляцоўкі. На базе новай школы неўзабаве будуць адкрытыя 5 спартыўных секцый.

Гэта толькі першыя прыклады мясцовых ініцыятываў, увасобленыя ў жыццё, дзякуючы падтрымцы Еўрасаюза. Конкурс праектаў, скіраваных на вырашэнне сацыяльна-эканамічных і экалагічных праблем, праходзіць у чатырох раёнах Гомельскай вобласці: Буда-Кашалёўскім, Веткаўскім, Жыткавіцкім і Хойніцкім. Мэта конкурсу — знайсці энтузіястаў і падтрымаць ініцыятывы тых мясцовых жыхароў, якія не проста чакаюць дапамогі збоку, а самі разважаюць, як можна палепшыць сваё жыццё. На конкурс былі пададзеныя 80 заявак, якія змяшчаюць канкрэтныя прапановы (па сутнасці, гатовых праектаў), што могуць палепшыць сітуацыю з адукацыяй, медыцынай, спортам і вольным часам.

На стварэнне ў Беларусі Цэнтра па лячэнні шчытападобнай залозы ЕС вылучыў мільён еўра.

У гэтай клініцы будуць занятыя найлепшыя дактары-спецыялісты па лячэнні захворванняў шчытападобнай залозы, беларусам стане даступная ўнікальная дыягнастычная лабараторыя. Кожны зможа бясплатна абследавацца ў новым цэнтры і пры неабходнасці атрымаць якасную кансультацыю і лячэнне.

Пакуль у будынку будучага цэнтра завяршаюцца апошнія працы, лекары ў межах праекта ЕС ужо абследуюць людзей у радыяцыйна небяспечных раёнах Беларусі. Першым такім горадам стаў Мазыр — там у красавіку 2010 г. былі праведзеныя масавыя медыцынскія абследаванні дарослых і дзяцей.

Новая клініка таксама будзе займацца ўкараненнем новых метадаў лячэння. У цэнтры будуць выдаляць пашкоджаныя вузлы шчытападобнай залозы не скальпелем, а з дапамогай лазераў. Гэты метад забяспечвае вельмі добрыя вынікі.

**Віталь Ругайн**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Смажаніна з курыцы

1 вялікае кураня, соль, 1 лыжка масла, 1—2 сухарыкі

Падрыхтаваць тушку, ачысціўшы і выпатрашыўшы яе, пасаліць, завярнуць у паперу і спячы на ражне або на блясе, палівагочы маслам. Калі будзе гатовая, пасыпаць цёртымі сухарыкамі і паліць вадкасцю, якая ўтварылася падчас запякання.

**З кнігі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», 1864**

**Падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**КВАТЭРА**

**Здам** двухпакаёвую кватэру Т.: (029) 757-94-07.

**КНІГІ**

**Ахвотныя напісаць свой радавод**, купіце ў «Акадэмкнізе» ці на Машэрава, 8 кнігу Т.Рослік «Я ведаю, адкуль мой род».

**Прадам** поўныя зборы У.Караткевіча і Я.Купалы. Т.: (029) 271-77-22.

**Куплю** кнігу: Ян Шытлер «Кухар добра навучаны». Т. (029) 569-72-16.

**КАНТАКТЫ**

**Літаратар шукае напарніка**, пажадана маладафронтаўца. Крытэр: ён/яна мусіць мець інтэрнэт і роўныя рукі :) Звяртацца на е-мэйл: Caesar@me.by.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



**1)** Ці можна ў рэшаце ваду перанесці?

**2)** Трэба абнесці агароджай адзін бок агарода, даўжыня якога 30 м. Слупы будуць ставіць праз 10 м. Колькі спатрэбіцца слупоў для таго, каб абнесці агароджай адзін бок агарода?

**3)** Які гадзіннік паказвае правільны час толькі два разы ў суткі?

**4)** Будзільнік раніцай будзіць аднаго чалавека. Да яго прыехалі пяцёра гасцей. Начаваць будуць у адным пакоі. Колькі трэба будзільнікаў, каб яны ўранку прачнуліся ў патрэбны час?

**5)** У тры гадзіны ночы ідзе дождж. Ці можа быць сонечнае надвор'е праз 24 гадзіны?

**6)** Ніна і Маша разам маюць 14 гадоў, прычым Ніна на 10 гадоў старэйшая за Машу. Колькі гадоў Ніне і Машы?

**7)** Што лягчэйшае — 1 кг сухога лісця ці 1 кг цэглы?

**Сабрала Валянціна Карнялюк**

Адказы на старонцы 16.



# Модна насіць нацыянальнае

**Больш за 200 калекцыяў былі паказаныя падчас XIX Міжнароднага фестывалю моды і фота «Млын моды — 2010». Маладыя дызайнеры спаборнічалі ў намінацыях «Школа моды», «Майстра моды», «Pret-a-porter», а таксама «Стылізацыя нацыянальнага саслоўнага і прафесійнага касцюма». З апошняй намінацыі былі адабраныя некалькі строяў, якія ўпрыгожаць калекцыю Нацыянальнага музея. Беларускія дызайнеры не абышлі ўвагай і дзіцячае адзенне. Падчас заключнага шоу гледачам прадставілі спецпраект ад Цэнтра моладзевай моды БДУ з удзелам зорак тэатра, спорту і тэлебачання.**

**Юлія Дарашкевіч**

Юлія Дарашкевіч

## Анекдоты

* * *

Экстрэмал, які здзяйсняў зацяжны скачок з парашутам, праляцеў міма Зямлі.

* * *

Разметка на дарогах трэба, каб падзяляць ямы і калдобіны між удзельнікамі дарожнага руху пароўну.

* * *

Гарады трэба будаваць у вёсках — там паветра чысцейшае.

* * *

— Каго вы нам прыслалі? Нам трэба была пара нармальных хлопцаў!

— А гэта і ёсць паранармальныя хлопцы!

* * *

Бог стварыў нас па сваім вобразе і падабенстве. Але адкуль пэўнасць, што ён працаваў у рэалістычнай манеры?

## «НН» сто гадоў з вамі

У поездзе з Вільні ў Пецярбург паліцыя западозрыла нейкую кабету, што ехала з сямю дзяўчынамі і тыя называлі яе «мамай». «Маму» арыштавалі, і, як аказалася, везла яна сваіх прыбраных «дачок» у Пецярбург на продаж. Пяць дзяўчат вярнулі ў Вільню.

**«НН». №20. 1910**

Удзень 14 траўня на 25-м кіламетры шашы Заслаўе—Калодзішчы ў аварыю трапіў Уладзімір Мулявін. «Пясняр», які ехаў на сваім «Мерсэдэсе-420», не даў рады кіраванню — машына вылецела на ўзбочыну, некалькі разоў перакулілася і далася ў дрэва. Мулявін у крытычным стане трапіў у 2-ю клінічную бальніцу Мінска.

**«НН». № 17. 2000**




**Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь у дзеянні: на беларуска-расійскай мяжы ўжо доўгі час стаіць указальнік з памылкай: замест Respublic па-англійску напісана Republik.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Жыхары вёскі Пагост (Жыткавіцкі раён) правялі 6 мая традыцыйны абрад «Юр'е». У гэты дзень абыходзяць палі, а таксама ўпершыню выганяюць кароваў на пашу.**

**У Германіі пачаўся чэмпіянат свету па хакеі. У першым матчы зборная гаспадароў нечакана перамагла амерыканскую. За гэтым сачылі 77803 гледачы — то новы сусветны рэкорд наведвальнасці хакея.**






**Адказы да старонкі 15:**

**1.** Можна. Ваду можна замарозіць. **2.** 11 слупоў. **3.** Гадзіннік, які стаіць. **4.** Адзін. **5.** Не, бо гэта будзе ноч. **6.** Ніне — 12, Машы — 2. **7.** Вага аднолькавая.

Наша Ніва
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Мінск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@nn.by
On-line: www.nn.by

© НАША НІВА. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6345. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 11.05.2010.
Замова № 2249.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9771819161008 10018